№ 3(33)/2001

# Беларускія Ведамасьці

ВАРШАВА, сакавік 2001 г.

## НЕ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА — ГАЛОЎНАЕ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ, А НЕЗАЛЕЖНАСЬЦЬ І СВАБОДА, БО НЕ БЫВАЕ „ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА” ПАД АКУПАЦЫЯЙ




*Вашынгтон, 25 Сакавіка. Беларуская дэманстрацыя каля беларускай амбасады.*

## 25 САКАВІКА — НАЙВЯЛІКШАЕ СЬВЯТА БЕЛАРУСАЎ

*(заява)*

Гэтым днём 1918 года была абвешчана незалежнасьць ***Беларускае Народнае Рэспублікі (БНР)***. Стварэньне або адраджэньне нацыянальнае дзяржавы — сэнс гістарычнага існаваньня кожнага народа. Абвешчаньне *БНР* сталася вынікам велізарных высілкаў, працы і ахвяраў беларускіх адраджэнцаў і зьяўляецца для беларусаў найвялікшай падзеяй XX-га стагоддзя. Прыняцьцём *АКТУ 25 САКАВІКА 1918 года* быў завершаны доўгі гістарычны шлях нашага народу да пачатку адраджэньня беларускае дзяржаўнасьці і дэмакратычных свабодаў.

Гісторыяй не было наканавана збыцца ідэалам *БНР* тады, калі яны былі абвешчаныя. Акупацыя беларускіх земляў бальшавіцкай Расеяй на дзесяцігоддзі прыпыніла нашую незалежніцкую хаду. Рускія бальшавікі зьнеслаўлялі і гвалтоўна зьнішчалі ўсё, што было зьвязана зь беларускай нацыянальнай ідэяй і беларускім адраджэньнем.

Але высакародныя ідэі *БНР* ніколі не паміралі. Гэта пацьверджана ў 1991 годзе, калі была адноўлена незалежнасьць Беларусі пасьля ліквідацыі маскоўскай улады КПСС. Рэспубліку Беларусь як незалежную дзяржаву прызналі ва ўсім сьвеце. На дзяржаўны пасад былі вернутыя нашы сьвятыя гістарычныя сымвалы: гэрб *ПАГОНЯ* і



**Менск, 25 Сакавіка. Дзень Незалежнасьці. Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя Народнага Фронту ў цэнтры сталіцы.**

*„Адраджэньне”* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* зьвяртаюцца да грамадзянаў Беларусі з заклікам далучыцца да *Вызвольнага Руху* і мацаваць *Беларускую Салідарнасьць.* Пагроза нацыянальнаму існаваньню павінна зьяднаць усіх беларусаў для адстойваньня палітычнай і эканамічнай незалежнасьці Беларусі.

Сёньня, як і ў 20-я гады XX стагоддзя, зноў актуальныя несьмяротныя словы вялікага паэта і прарока Беларускага Адраджэньня ***Янкі Купалы***: ***„БЕЛАРУСЬ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ”***.

Няхай жывуць ідэалы БНР!
Жыве Беларусь!
Жыве вечна!

***(Прынята Соймам Беларускага Народнага Фронту „Адраджэньне” і Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.*** *10 сакавіка 2001 г.)*

*БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫ СЬЦЯГ.* Распачалося адраджэньне беларускай мовы і беларускай культуры, беларускай гаспадаркі. Стала паўставаць беларускае прадпрымальніцтва. Беларусы пачалі ўсьведамляць свае нацыянальныя інтарэсы, адраджалася нацыянальная салідарнасьць.

Такі ход падзеяў у Беларусі выклікаў шалёную нянавісьць расейскіх імпэрыялістаў. Яны пачалі рыхтаваць чарговую акупацыю беларускае дзяржавы. Гэтым разам за справу ўзяўся **КГБ-ФСБ**, які пачаў ажыцьцяўляць акупацыйныя пляны праз сваіх агентаў і стаўленьнікаў. Для ідэалягічнага прыкрыцьця акупацыі КГБ-ФСБ стаў выкарыстоўваць лёзунгі „единение”, „интеграция”, „союз братских славянских народов” і г.д.

За некалькі гадоў на Беларусі адбылася ўнутраная акупацыя, ажыцьцёўленая расейскімі спэцслужбамі. Яе сутнасьць у наступным.

Асноўныя пасады ў сістэме ўлады ўжо занятыя расейцамі-функцыянэрамі КГБ, генэраламі ды палкоўнікамі. Беларусы з вышэйшых структураў кіраўніцтва цяперашняй Беларусі выдаленыя. Акупацыйная ўлада пасьлядоўна зьнішчае ўсё беларускае. Яна завяршае працэс закрыцьця беларускіх школаў, жорстка перасьледуе беларускую мову, дэманстратыўна фальсіфікуе беларускую гісторыю. Разбурае беларускую культуру, гаспадарку, эканоміку, беларускае прадпрымальніцтва. Большасьць беларускага народа няўхільна бяднее. Ягоная працоўная дзейнасьць дазваляе толькі выжываць. Паскоранымі тэмпамі скарачаецца працягласьць жыцьця насельніцтва. Усё гэта прывяло да зьмяншэньня насельніцтва Беларусі за апошнія гады амаль на паўмільёна.

Акупацыйная ўлада ўжо падрыхтавала ўмовы для лёгкага і дармавога захопу беларускай уласнасьці іншаземцамі. Для гэтага яны намерваюцца ў бліжэйшы час правесьці „прыватызацыю” для сябе і па сваіх правілах. У выніку — найбольш прыбытковыя прадпрыемствы пяройдуць у рукі расейскіх алігархаў і мафіёзных груповак.

Тое, што адбываецца з нашай краінаю, ёсьць *этнічная і народная катастрофа*, гэта наступствы расейскай акупацыі і палітыкі дзяржаўнай здрады. У такіх умовах нацыя павінна ратавацца. *Паратунак — у ліквідацыі акупацыйнага рэжыму і палітыкі дзяржаўнай здрады.*

Альтэрнатывай рэжыму расейскай акупацыі і палітыцы дзяржаўнай здрады — як і ў часы *БНР* — ёсьць ***Нацыянальна-Вызвольны Рух Беларускага Адраджэньня.*** Ён зьяўляецца рэальнай сілай, якая выяўляе нацыянальныя інтарэсы Беларускага Народу і супроцьстаіць расейскай імпэрскай палітыцы інтэграцыі і захопу нашай краіны.

Сойм грамадзкага аб’яднаньня *Беларускі Народны Фронт*

# ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

*Дзень Незалежнасьці* і *83-я ўгодкі Беларускай Народнай Рэспублікі* пачалі сьвяткаваць ў Нью-Ёрку ўжо 18-га сакавіка. Гарадзкі аддзел *БАЗА* наладзіў урачыстасьць. Прысутнічалі прадстаўнікі „Х’юман Райтс Вотч” і Дзяржэпартаманту. З рэфэратам і дакладамі выступілі *Старшыня Галоўнай Управы БАЗА спадар* ***Антон Шукелойць***, *Старшыня Рады БНР* ***Івонка Сурвіла***, *прадстаўнік Дзярждэпартаманту* ***Джон Армстронг****, спадары* ***Янка Запруднік***, ***Вітаўт Кіпель***, *Старшыня Беларускага Народнага Фронту* ***Зянон Пазьняк*** і іншыя.

Потым было чытаньне вершаў, сьпяваньне і музыка. *Спадарыня* ***Валянціна Якімовіч*** арганізавала і паказала выставу аўтэнтычных беларускіх народных строяў.

*25 Сакавіка* каля 40 беларусаў зь Нью-Ёрку, Нью-Джэрзі і ваколіц прыехалі аўтобусам у Вашынгтон і правялі тут дзьве энэргічныя дэманстрацыі пратэсту перад беларускай і расейскай амбасадамі супраць здрады і агрэсіі расейскай каляніяльнай палітыкі. Было шмат лёзунгаў, сьцягоў і плякатаў, якія заклікалі прэзыдэнта Буша не даваць болей расейцам ні грошай, ні крэдытаў, пакуль не адмовяцца ад сваёй нэакаляніяльнай палітыкі ў дачыненьні да Беларусі. Па некалькі разоў дружна сьпявалі беларускія гімны. Выступалі кіраўнікі *БАЗА* і *БНФ*. Раздавалі ўлёткі і паведамленьні. Часам на вуліцы спынялася машына, выходзіў амэрыканец і прасіў улётку, каб пачытаць.

Потым уся грамада паехала пад Белы Дом да помніка слаўнага беларуса ***Тадэвуша Андрэя Касьцюшкі***. У кампазіцыі помніка адлюстраваны ня толькі сам наш герой *Касьцюшка*, але і яго асяроддзе. Між іншым, беларускі касіянер з баявой касой у руках і кайстрай за плячыма. Ён у баі падтрымлівае раненага змагара.

У Менску галоўная ідэалягічная падзея сьвята разгортвалася на праспэкце Скарыны. У гэтым — сэнс. Ішла барацьба за гонар, за цэнтар сталіцы. На мінулагодні Дзень Незалежнасьці *Беларускі Народны Фронт* і яго *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* распачалі гэтае змаганьне. Рэжым кінуў на недапушчэньне акцыі бронетранспарцёры, сабак, тысячы амапаўцаў і „спэцназу”. Было схоплена і пабіта тады некалькі соцен фронтаўцаў і сяброў Партыі, учынена спроба забойства Выконваючага абавязкі Старшыні БНФ ***Юры Беленькага***.

Сёлета фронтаўцы выйшлі невялікімі сіламі (ня больш за 600

асобаў), але беларускія сьцягі луналі ў самым цэнтры, ад плошчы Незалежнасьці да будынка ГУМа, гучэлі беларускія гімны і песьні. Усё гэта выглядала прыстойна.




*25 Сакавіка. Беларуская дэманстрацыя каля расейскай амбасады ў Вашынгтоне.*

Шэсьце не было санкцыянавана. На праспэкце сканцэнтравалася шмат міліцыі, на чале з Міністрам МУС Навумавым, у дварах затаіліся дзясяткі машын са спэцназам і АМАПам. Але на гэты раз нападзеньня на дэманстрантаў не адбылося.

У адраджэньні велічы змагарнай традыцыі вулічных акцыяў *Фронту* прыходзіцца пачынаць цяпер амаль што з нуля. І нават не з нуля, а зь мінуса. Вулічныя акцыі *Фронту*, якія заўсёды праходзілі арганізавана, масава, прыстойна і высакародна, былі яго вялікай сілай і перавагай. Але антыбеларуская, антыфронтаўская праца за новым прамаскоўскім рэжымам была вельмі падступнай. Пачынаючы з 1997 года, ішло мэтанакіраванае разбурэньне парадку вулічных акцыяў БНФ. Выконваючы абавязкі Старшыні БНФ **Л.Баршчэўскі** ня тое, што не разумеў таго, што адбываецца і пра што яму казалі і пісалі калегі, а нават спрыяў развалу, аддаючы кантроль над сітуацыяй маргіналам, правакатарам ды агентуры, пускаючы безадказных і ні нашто нясдольных „дэмакратаў" у арганізацыю і кіраўніцтва вуліцай.

Дэманстрацыі, пасьля ўтраты над імі кантролю *Фронта*, ператварыліся ў некіруемыя натоўпы, якія здымалі афіцыйныя тэлеапэратары і фрагмэнты (выбарачна) са смакаваньнем і зьдзекам паказвала рэжымнае тэлебачаньне. Улады сьпіхнулі дэманстрацыі на былое балота (плошча Бангалёр) і „дэмакраты" пакорна згадзіліся. (Адзін цынік-дэмакрат нават апраўдваўся, што беларусы, маўляў, здаўна жылі на балоце, дык сабачнік Бангалёр для іх — самы раз.)

Цяпер абноўлены *Фронт* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* імкнуцца выправіць становішча. А гэта ўжо — карпатлівая і нялёгкая праца.

Тым часам стракатыя рэшткі „аб'яднанай апазыцыі" сабраліся сёлета на пляцы Волі і адтуль бязладным натоўпам (каля паўтары тысячы чалавек) пайшлі бязмэтна на край горада за гатэль „Юбілейны" і Палац спорту да савецкай скульптуры (кабеты з заклікам кудысьці).

Там правакатары і нейкія маладзёны (як звычайна, некіруемыя) пачалі кідаць сьнежкамі і ільдом у міліцыянераў (без прычыны і без патрэбы), чым выклікалі напад АМАПа, пабіцьцё людзей і арышты. (Арыштавалі каля дзясятка дэманстрантаў.)

Сур'ёзнай змагарнай вуліцы ўжо няма. Задача гэтай пазыцыі ёсьць вялікая шкода, нанесеная беларускаму Адраджэньню так званымі „грантавымі прагматыкамі" ў старым Фронце.

*Абноўлены Фронт пазбавіўся „прагматыкаў".* Цяпер крок за крокам ён імкнецца адрадзіць парадак і павагу, апору на сур'ёзных людзей і сур'ёзнасьць змаганьня за вольную Беларусь.

Грамадзкае сьвяткаваньне Дня Незалежнасьці адбывалася ва ўсіх буйных і шмат якіх сярэдніх гарадах краіны. У Магілёве сьвяткавалі ў асноўным Фронт і сацыял-дэмакраты.

*24 сакавіка ў Віцебску* адбылося некалькі пікетаў, у тым ліку, дзьве акцыі моладзі. На Ратушнай плошчы наладзілі несанкцыянаваны пікет сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* і *Народнага Фронту*. Міліцыя спрабавала арыштаваць ***Уладзімера Плешчанку***. У гэты час каля помніка Леніну ладзілі пікет таксама прадстаўнікі дэмакратычных партыяў.

*У Горадні* ўлады ўсяляк імкнуліся перашкодзіць дэманстрантам і вывелі на вуліцы больш за паўтысячы міліцыянераў ды салдатаў АМАПу.

*У Берасьці* міліцыя хапала людзей, якія раздавалі сьвяточныя ўлёткі. Вечарам адбылася ўніяцкая служба за Беларусь.



*25 Сакавіка, Вашынгтон. Перад помнікам Тадэвушу Андрэю Касьцюшку.*




***Горадня, 25 Сакавіка. Шэсьце ў цэнтр горада.***

праводзілі пікеты ля помніка Сымону Буднаму, віншавалі землякоў са сьвятам і зьбіралі подпісы ў абарону незалежнасьці Беларусі. Сьцягі і плякаты: ***„Будзем верныя ідэалам БНР”*** і інш.

Сьвяточныя імпрэзы адбыліся *ў Клецку* і *Крычаве.*

*У Гомелі* міліцыя і АМАП хацелі арыштаваць увесь фронтаўскі пікет *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ.* Аднак кіраўнікі дэманстрацыі ***Уладзімер Старчанка*** і ***Алеся Кацапава*** прапанавалі арыштаваць сябе, узамен за ўсіх. Міліцыя пагадзілася.

*У Мазыры* зьявіліся выявы *Бел-Чырвона-Белых сьцягоў* і ўлёткі. Міліцыя схапіла двух студэнтаў, дзяўчынку-сямікласьніцу ***Кацю Туркалаву*** і Старшыню суполкі *БНФ* ***Юры Чаранкова***.

*У Жлобіне* пікет наладзілі актывісты *БНФ.*

*У Воршы* таксама адбылася імша за Бацькаўшчыну *ў касьцёле сьвятога Язэпа*. Потым ля помніка Ул.Караткевічу сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* наладзілі несанкцыянаваны пікет у гонар 83 гадавіны БНР.

*У Пінску* на высакавольтным дроце *(110.000 вольт)* на вышыні 20 мэтраў ад зямлі змагары вывесілі пяцімэтровы плякат з надпісам: ***„ЗЯНОН, РАТУЙ БЕЛАРУСЬ!”***, а таксама вялікі *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг.* Пінскія сябры *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* наведалі таксама вёску *Парэчча*, дзе пахаваны Старшыня Ўраду БНР у 1918 годзе ***Раман Скірмунт*** і ўшанавалі яго памяць.

*У Баранавічах* сабралася некалькі сотняў маладых беларусаў з *Фронту* і *Грамады* пад лёзунгамі: ***„Беларусь не аддамо нікому!”***, ***„Жыве Беларусь!”***

*У Наваполацку (Баравуха)* зьявіўся надпіс мэтровымі літарамі: ***„Бог, Беларусь, Воля”***, адбыліся пікеты.

*У Барысаве* на высокіх будынках вывесілі *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі.*

*У Нясьвіжы 24* і *25 сакавіка* актывісты *Фронту, ТБМ* і *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ, Маладога Фронту*

У цэнтры мястэчка *Вялікая Бераставіца* ў ноч на 25 Сакавіка вывешаныя *Бел-Чырвона-Белыя сьцягі*. На будынках зьявіліся надпісы *„Жыве Беларусь!”* і *„Наш дом — Беларусь!”*

***Пётра ЯНОЎСКІ***

## „BELARUSAN INDEPENDENCE DAY”

*Сёлета, дзякуючы стараньням беларускай эміграцыі ў ЗША, і найперш — ініцыятыве спадарыні* ***Алы Орсы-Рамана****, губэрнатар штату Нью-Ёрк* ***Джордж Патакі*** *і мэр горада Нью-Ёрк* ***Рудольф Джуліяні*** *прынялі адпаведныя ўхвалы (proclamation), у якіх дзень 25 Сакавіка абвяшчаецца “Днём Беларускай Назалежнасьці”.*

*Ва ўхвале мэра Джуліяні акрамя таго коратка выкладзена гісторыя беларускай дзяржаўнасьці, пачынаючы ад 980 года. Ухвала губэрнатара Патакі кароткая і мы падаём тут яе ў перакладзе па-беларуску:*

### *ШТАТ НЬЮ-ЁРК, ВЫКАНАЎЧАЯ КАМОРА*

Бяручы пад увагу, што 25 Сакавіка 1918 году Ўсебеларускі Кангрэс абвясьціў незалежнасьць Беларускай Народнай Рэспублікі і што была прынятая дэклярацыя, якая забясьпечвала свабоду слова, друку і сходаў, ды былі зробленыя іншыя крокі для абароны свабоды і годнасьці асобы, і што імкненьне Беларускага народу да незалежнасьці й дэмакратыі ёсьць натхненьнем для ўсіх і заслугоўвае падтрымкі ўсяго вольнага сьвету, і што тысячы амэрыканскіх грамадзянаў беларускага паходжаньня, якія жывуць цяпер у штаце Нью-Ёрк, сьвяткуюць 83-я ўгодкі абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі — дзеля гэтага я, Джордж Э. Патакі, Губэрнатар Штату Нью-Ёрк гэтым абвяшчаю 25 Сакавіка 2001 года як ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ ў Штаце Нью-Ёрк

***Дж. Э. ПАТАКІ***
***Губэрнатар***



***Горадня, 25 Сакавіка. Блякаваны міліцыяй цэнтр горада.***

# БЕЛАРУСКІ СЬЦЯГ

Давайце пагаворым пра нацыянальны сьцяг. Гэта значыць, пра рэчы відавочныя і таемныя, рэальныя і містычныя.

Нацыянальны сьцяг — гэта каляровае палатно, як правіла, прастакутнага памеру, якое зьяўляецца сымвалам нацыі. Бываюць людзі, якіх сьцяг нічым ня ўзрушвае: палатно як палатно. Іншыя — дзеля сьцяга ахвяруюцца жыцьцём, адносяцца да яго з піэтэтам і з найвялікшай павагай.

Адносіны да сьцяга паказваюць на ўзровень нацыянальнай кансалідацыі і нацыянальнай сьведамасьці народа. І што важна: тут існуе ўзаемаабарачальная сувязь. Народ падтрымлівае сьцяг, а сузіраньне сьцяга — кансалідуе народ.

Успомнім нядаўняе мінулае, як адносіліся да беларускага нацыянальнага сьцяга на Беларусі функцыянэры КПСС. Калі ўжо перад канцом Савецкага Саюзу камуністы ня мелі моцы, яны стараліся ўсімі сіламі прынізіць, зьменшыць значэньне сьцяга. „Ім бы толькі флажкі", — крычалі яны ў Вярхоўным Савеце на Народны Фронт. Маўляў, ёсьць больш важныя рэчы, чым сьцяг.

Але як толькі расейскаму КГБ удалося прывесьці на прэзыдэнцкі пасад Лукашэнку, першае, з чаго яны пачалі — гэта зь ліквідацыі беларускага дзяржаўнага сьцяга. Пры гэтым, не лічыліся ні зь якімі выдаткамі.

У барацьбе за беларускі сьцяг цяперашняя рэчаіснасьць нарадзіла сапраўдных герояў. Паглядзім на подзьвігі няўлоўнага МІРОНА, які ўжо некалькі гадоў вывешвае Бел-Чырвона-Белы Сьцяг на самых высокіх і недаступных месцах, і заўсёды пакідае пры гэтым запіскі патрыятычнага зьместу.

Апошні подзьвіг Мірона, які ён ажыцьцявіў на другі Дзень Нараджэньня Хрыстовага 26 сьнежня мінулага году ў Віцебску, уражвае сваёй сьмеласьцю. Мірон сярод белага дня вывешаў беларускі сьцяг над горадам на 110-мэтровай вышыні (на коміне гарадзкой цеплацэнтралі). Убраны ў барвовы плашч, гэты рыцар беларускага сьцяга працаваў на вышыні, на марозным ветры амаль пяць гадзінаў, дзёрзка, навідавоку ўсяго горада. Унізе яго ўжо чакала пастка, але Мірон, дзякуючы беларускай кемлівасьці, спусьціўся з гары і здолеў не патрапіць у рукі ахоўнікаў. Ён зноў няўлоўна зьнік, не адкрыўшы свой твар.

Я мяркую, што неўзабаве, пасьля таго, як будзе скінуты ў Беларусі прамаскоўскі рэжым, — урачыстае ўздыманьне беларускага сьцягу над парлямантам і Домам ураду пад велічныя гукі беларускага духоўнага гімну будзе даручана герою беларускага сьцяга — Мірону, які ў гэты момант адкрые сваё аблічча.

Прыгледзімся да нашага сьцяга.

Ён заўсёды відаць здалёку як самая яркая зьява ў прасторы, якія б фарбы і аб'ёмы вакол ні былі. Гэта настолькі відавочна, што ўражвае.

Калі глядзець на наш сьцяг зблізку і асабліва, калі сьцягоў шмат і разьвіваюцца пад сонцам, — відовішча вельмі велічнае. Зьяўляецца ілюзія, што над сьцягамі і ў гушчы сьцягоў узьнікае канцэнтрацыя сьвятла. Гэтае месца ня проста самае сьветлае ў прасторы; уражаньне, што яно вылучае сьвятло. Прытым ілюзія вельмі моцная. Ніякія іншыя сьцягі зь іншымі прапорцыямі і спалучэньнямі колераў не набліжаюцца ў гэтым да эфэкту беларускага сьцяга.

Вельмі яркае таксама псіхалягічнае адчуваньне ад сузіраньня беларускіх сьцягоў. Гэта адчуваньне прыўзьнятай радасьці і надзвычайнай чыстасьці. Прытым ізноў жа — гэтае адчуваньне вельмі моцнае і аб'ектыўнае. Яго сьведама і падсьведама перажываюць усе людзі (прынамсі, пераважная большасьць).

Адразу скажу, што тут няма ніякай містыкі. Тут спрацоўваюць аб'ектыўныя законы ўспрыняцьця колераў, іхных прапорцыяў і камбінацыяў. У беларускім сьцягу ідэальна збалянсаваныя белы і чырвоны колеры. Знойдзена мера раўнавагі. Беларускі сьцяг візуальна гарманічны, бо чырвонае і белае ўраўнаважаны. Для раўнавагі гэтых колераў патрэбная якраз парпорцыя: адзін да двух.

Як прапорцыя колераў уплывае на гармонію цэласьці можна пераканацца, калі сузіраць сьцягі Інданэзіі і Польшчы, якія аднолькавыя — бела-чырвоныя (толькі іншы колерны парадак верху і нізу палатна). Тут уражаньне несімэтрычнай распалавіненасьці плошчы, ілюзія дысанансу, бо чырвонага шмат, і гэты колер выглядае цяжкім. У прапорцыі ж 1 : 2, як у беларускім сьцягу, чырвоны колер лёгкі, ён плыве, уецца, палымнее на белым, не цягне на дол, а нібы лунае ў белай прасторы. Тыя ж колеры, але ў розных прапорцыях, выклікаюць розны візуальны і псіхалягічны эфэкт.

Немалаважны і сутнасны выбар колеру. Самы яркі колер ёсьць белы, але ў рэальнасьці самым яркім колерам на Зямлі лічыцца жоўты (тут псіхалягічны эфэкт жоўтага сонца). Тым часам ніякі жоўты сьцяг і ніякая камбінацыя жоўтага зь белым, ці жоўтага з чырвоным ня будзе ярчэйшай і сьвятлейшай за беларускі Бел-Чырвона-Белы Сьцяг (я ўжо не кажу пра псіхалёгію ўспрыняцьця). Ня дасьць лепшага эфекту таксама толькі белы, ці тым больш — толькі чырвоны сьцяг.

Мастацтвазнаўцы і мастакі-калярысты ведаюць, што ёсьць колеры, якія сумяшчаюцца і гарманізуюцца, і колеры, якія не сумяшчаюцца і не гарманізуюцца. Напрыклад, зялёны і чарвоны колеры — несумяшчальныя, згарманізаваць іх разам практычна немагчыма. Тым часам зь белым можна сумясьціць і згарманізаваць любы колер.

На беларускім сьцягу згарманізаваны самы „гарачы" колер чырвонага, ці, як яшчэ кажуць, „цёплага" краю спэктара. Кожны колер, які бачны ў прыродзе, нясе аб'ектыўную псіхалягічную нагрузку і фактычна аднолькава псіхалягічна ўспрымаецца большасьцю людзей. Гэтая ж аб'ектыўная аснова псіхалягічнага ўспрыняцьця выяўляецца і ў камбінацыі колераў, якія мастак сумяшчае па законах эстэтыкі.

Гарманізацыя белага з чырвоным у прапорцыі 1 : 2 аблягчае цяжкую псіхалягічную актыўнасьць чырвані і на балянсе кантрасту актывізуе (высьвятляе) белы фон, ад чаго ўзьнікае ілюзія сьвятла і палымненьня ўсёй бел-чырвона-белай карціны.

Калі прааналізаваць гэтак усё да канца, то прыходзім да высновы, што ***Бел-Чырвона-Белы Сьцяг ёсьць ідэальным візуальным выяўленьнем гармоніі самых актыўных колераў — чырвонага і белага — і найвыразьнейшым выяўленьнем псіхалягічнага вобразу чыстасьці і радаснага ўздыму. Гэта оптымум ідэі радасьці і сьвятла і оптымум візуальнай яркасьці***.

Далей я буду гаварыць пра рэчы, набліжаныя да містыкі, над якімі нельга не задумацца.

Беларускі Бел-Чырвона-Белы Сьцяг вядомы яшчэ з сярэднявечча. У XV і XVI стагоддзях ён ужо лунае на піках беларускіх рыцараў.

Канцэпцыя гармоніі белага з чырвоным вядома на Беларусі з глыбокай старажытнасьці, яшчэ з дапісьмовых часоў, і матэрыялізавалася ў адзеньні. Сутнасьць яе ў тым, што дзейнікамі выступалі толькі чырвоны і белы колеры, і спалучэньне іх не перакрочвала прапорцыі 1 : 2. Чырвоны колер быў акцэнтам, але не дамінаваў удзельна (гэта значыць, па плошчы запаўненьня). Нашыя старажытныя продкі адчувалі законы гармоніі.

У хрысьціянскай старажытнасьці склалася традыцыя сымвалізацыі прыходу Месіі. Гэта чырвоны крыж ці чырвоная паласа на белым фоне. Тут сымвалізацыя дарогі Боскага Духу, духоўнага шляху на чыстасьці стварэньня. Тут чырвоны, гарачы шлях Хрыстовай Веры і Любові праз вечнасьць сьветабудовы да вечнага Бога.

У сярэднявеччы шмат дзе на карцінах мастакоў можна было бачыць выяву Ісуса Хрыста зь Бел-Чырвона-Белай харугвай крыжа ці зь Бел-Чырвона-Белым Сьцягам у руцэ. Бел-Чырвона-Белы Сьцяг з чырвоным крыжам ці чырвонай паласой на карцінах сярэднявечча выступае як атрыбут Езуса, як ягоны Боскі знак і Боскі Сьцяг (П'ера дэла Франчэска, Тржэбоньскі Майстар, ангельскія мініятуры 12-13 стагоддзяў і інш.)

З першага погляду відаць, што беларускі сьцяг вельмі просты. Шмат якія дзяржаўныя сьцягі на сьвеце у агульным супадаюць, паўтараюцца

ў вобразе ці мадыфікуюць адзін аднаго. Нідзе і блізка не паўтараецца толькі беларускі сьцяг. Няма нават мадыфікацыяў. Некаторых беларусаў гэта здумляе. А можа, невыпадкова, што нацыя, якая стагоддзямі ўваскрасае ў пакутах і муках, мае сьцяг Ісуса Хрыста?

Але, пэўна ж, містыка тут ні пры чым: ці мала ёсьць пакутнікаў на сьвеце. І ўсё ж такі, і ўсё ж... Нічога не бывае бяз сэнсу.

Які сэнс вынікае зь гісторыі нашага сьцяга?

Я задаваў гэтае пытаньне беларусам. Кожны нешта тлумачыў, і ніхто не адмаўляў эзэтэрычнага зьместу. Адзін беларускі сьвятар у Амэрыцы сказаў мне: *„Беларускі народ ёсьць выбраным народам на Другое Прышэсьце. Толькі пра гэта ніхто ня будзе ведаць”.*

Такі вось апокрыф. Але калі так, то пра гэта ня мусіў бы ведаць таксама і сьвятар.

Відаць, нічога не парадзім мы з містыкай сьцяга. Але неабходна радзіць з рэчаіснасьцю. А рэчаіснасьць такая: ***пакуль ёсьць, лунае й жыве наш беларускі сьцяг — жыве і Беларусь. Шануйма ж яго і ўздымайма высока. Ён, найпрыгажэйшы на сьвеце, ёсьць увасабленьне нашай краіны, нашай народнай моцы і нашай веры. Ён сымвал нашай беларускай народнай вечнасьці***.

***Зянон ПАЗЬНЯК***
***кандыдат мастацтвазнаўства***

*8 лютага 2001 г.*

# ПРА ЭКАНАМІЧНУЮ АГРЭСІЮ ІМПЭРСКІХ КОЛАЎ РАСЕІ

*(Заява)*

*21 лютага 2001 г.* Дзяржрума Расеі ратыфікавала пагадненьне пра ўвядзеньне ў Беларусі расейскага рубля, якое ў лістападзе 2000 г. падпісалі Лукашэнка і Пуцін. Расейская мафія так сьпяшаецца захапіць уласнасьць Беларусі, што нават ня стала чакаць, пакуль гэты антыканстытуцыйны акт ратыфікуе лукашэнкаўская „палата”. Дзеяньні прэзыдэнта Расеі Пуціна і Дзяржрумы Расеі ёсьць акт вонкавай агрэсіі.

Па-іншаму кваліфікуецца дзейнасьць асобаў і органаў рэжыму зь беларускага боку. Лукашэнка, падпісаўшы пагадненьне, парушыў артыкулы 136,8 і 1 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Гэтыя артыкулы ўсталёўваюць наступныя палажэньні:

— Арт. 136: „...***Нацыянальны банк ... валодае выключным правам эмісіі грошай”.***

— Арт. 8, абзац 3: „***Не дапускаецца заключэньне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі***”.

— Арт. 1, абзац 3: „***Рэспубліка Беларусь абараняе сваю незалежнасьць і тэрытарыяльную цэласнасьць, канстытуцыйны лад, забясьпечвае законнасьць і правапарадак***”.

У адпаведнасьці з падпісаным пагадненьнем Нацыянальны банк Беларусі будзе пазбаўлены права эмісіі, а дзяржава пазбаўляецца асноўнага чыньніку сувэрэнітэту і нацыянальнай бясьпекі — уласных грошай. Лукашэнка сьведама пайшоў на непасрэднае парушэньне асноўнага Закону Рэспублікі Беларусь — Канстытуцыі. Паводле Крымінальнага кодэксу Рэспублікі Беларусь (разьдзел 13, гл.32, арт. 356) характар зьдзейсьненага парушэньня ўтрымоўвае ўсе нормы, якія кваліфікуюцца як дзяржаўная здрада. „Статья 356:

... оказание помощи иностранному государству в проведении враждебной деятельности против Республики Беларусь путём совершения преступлений против государства по заданию органов или представителей иностранного государства, умышленно совершённые гражданином Республики Беларусь **в ущерб внешней безопасности Республики Беларусь, её суверенитету**, *территориальной неприкосновенности,* **национальной безопасности и обороноспособности (измена государству)**, *наказывается лишением свободы на срок от семи до пятнадцати лет”.*

(Вытрымка пададзена па-расейску, бо беларускамоўнага тэксту не існуе).

Да злачынства зьбіраюцца спрычыніцца і дэпутаты незаконнай „палаты”. Да веснавой сэсіі яны рыхтуюць дакуманты, каб прагаласаваць за гэтае антыканстытуцыйнае пагадненьне. Ніякім „канстытуцыйным актам” (на што спадзяецца **Малафееў**, **Машэрава** ды ім падобныя) немагчыма будзе прыкрыць злачынства.

Згаданыя артыкулы Канстытуцыі могуць быць зьмененыя толькі шляхам рэфэрэндуму (нават паводле канстытуцыі ў рэдакцыі 1996 г., арт.140).

Злачынства, учыненае Лукашэнкам і ягоным рэжымам, цягне за сабой велізарныя страты і разбурэньні. На працягу сямі гадоў рэжым кансэрваваў савецкія мэтады вядзеньня гаспадаркі, душыў ініцыятыву беларусаў, беларускі бізнэс, не даваў разгарнуцца рэформам. Цяпер, калі расейская агентура завалодала асноўнымі пасадамі ў структурах улады і ў эканоміцы Беларусі, яна адкрыта вядзе акупацыйную палітыку ў інтарэсах расейскіх імпэрскіх колаў, дапамагае расейскім і мафіёзным структурам прыхапіць лепшыя беларускія прадпрыемствы і маёмасьць. Праз эканамічную агрэсію — увядзеньне расейскага рубля ў Беларусі — Расея пляцуе завершыць акупацыю Беларусі.

Мы зьвяртаем увагу грамадзянаў Беларусі на незаконныя і злачынныя дзеяньні А.Лукашэнкі і ягонага прамаскоўскага рэжыму. Лукашэнка з 20 ліпеня 1999 г. утрымлівае ўладу незаконна, сілавымі мэтадамі. Гэта зь ягонай дапамогай расейская агентура захапіла ключавыя пасады ў выканаўчых структурах улады, прамысловасьці і праводзіць палітыку на зьнішчэньне беларускай дзяржавы , на захоп беларускай уласнасьці, на асіміляцыю беларусаў, на выцясьненьне беларусаў з роднай зямлі.

Мы заяўляем, што змова пра стварэньне так званай „саюзнай” дзяржавы і яе рэалізацыя з боку Расеі ёсьць ***агрэсія супраць Беларусі, а з боку А.Лукашэнкі і ягонага рэжыму ёсьць дзяржаўная здрада***.

Мы зьвяртаемся да грамадзянаў Беларусі з заклікам згуртавацца перад пагрозай расейскай агрэсіі.

Мы заклікаем беларусаў абапірацца ў сваіх дзеяньнях толькі на Канстытуцыю і законнасьць. Указы, дэкрэты, распараджэньні, загады ды іншыя падзаконныя акты, якія супярэчаць Канстытуцыі і заканадаўству, не падлягаюць выкананьню.

*10.03.2001 г.*

***Сойм Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***

# ХРОНІКА ПАРУШЭНЬНЯЎ ПРАВОЎ БЕЛАРУСАЎ

## *ЛІСТАПАД (2000 год)*

*Лістапад: Напад рускіх фашыстаў.* Група рускіх фашыстаў зьбіла двух падлеткаў, якія размаўлялі па-беларуску. Гэта адбылося ў нядзелю на Лагойскім тракце ў менскім трамваі 6-га маршруту. Сьведка нападу ***Надзея Міхейчык*** кажа, што брытагаловыя ў скураных куртках былі старэйшыя, яны накінуліся на падлеткаў, білі іх, выкрыквалі прарасейскія лёзунгі ды брудна лаяліся. „Здаецца, каб людзі не заступіліся, іх бы забілі; малодшаму дык ледзь вока ня выбілі.Ягоны твар быў у крыві.”

Пасажырам удалося спыніць рускіх, і тыя павыскоквалі з трамвая на прыпынку, дэманстратыўна падняўшы правую руку ў фашыстоўскім прывітаньні.

З пачатку 2000 года ў Менску зафіксавана больш за 10 нападаў расейскіх фашыстаў на жыхароў горада.

Улады сталіцы і міліцыя дэманструюць прыхільнасьць да рускіх фашыстаў.

■ *„Ажыцьцяўляюцца запаветы Мураўёва-вешальніка...”* (*В. Іпатава*) Беларускую кніжку, сапраўды, мала чытаюць. Бальшыня школьнікаў сёньня вучыцца не ў беларускіх школах. Пісьменьнікам цяжка надрукаваць свой твор у дзяржаўных выдавецтвах. Зараз мікраскапічныя ганарары. А кніга — гэта плён напружанай працы некалькіх гадоў. Атрымліваецца, што праца пісьменьніка цэніцца ніжэй, чым праца прыбіральшчыцы. Такое немагчымае ндзе ў цывілізаваным сьвеце.

*Лістапад.* Беларускае дзяржаўнае радыё мае 39 гадзінаў эфіру на дзьвюх праграмах, і кіруе ім прызначэнец А.Лукашэнкі расеяц **У.Ядранцаў**. Радыёжурналісты ўжо некалькі разоў прымалі заявы аб недаверы гэтаму кіраўніку, але потым стала зразумела, што Ядранцаў будзе ачольваць радыё датуль, пакуль будзе трымацца сёньняшні рэжым. На нядаўнім зьезьдзе журналістаў ён заявіў: „Мы — найпершыя памочнікі кіраўніцтва нашай дзяржавы”.

На радыё ўведзеная татальная цэнзура. Спэцыяльныя „куратары” праглядаюць зьмест кожнай перадачы, і бяз іхных подпісаў перадача ня можа патрапіць у эфір.

Дзейнічае „чорны сьпіс” палітыкаў, прозьвішчы якіх нельга згадваць у эфіры. Нельга называць імя ***Ларысы Геніюш***. Пад строгай забаронай слова „спадар”, „травень”. Паціху пазбаўляюцца беларускай мовы. Напрыклад, радыёстанцыя „Сталіца”, якая вяшчае 12 гадзінаў на дзень на хвалях FM, пачала перадаваць навіны па-расейску.

*21 лістапада.* Недалёка ад Наваполацку ў пасёлку *Баравусе* залунаў вялічэзны *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг* (даўжыня каля 2-х з паловай мэтраў). Сьцяг быў прымацаваны да тэлефоннага кабэлю, што лучыў два 9-павярховікі, таму зьняць яго зь верхатуры вельмі складана.

Раніцай кіраўнік суполкі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі - БНФ **Анатоль Каханчык*** знайшоў каля кватэры цыдулку, у якой паведамлялася, што Сьцяг вывешаны ў гонар угодкаў *Слуцкага Збройнага Чыну.* ***Мірон*** пісаў, што ворагам Беларусі ніколі ня ўдасца зьнішчыць нашыя старажытныя сымвалы і памяць пра герояў *Случчыны*. Сьцяг доўга лунаў ў восеньскім небе.

*21 лістапада.* У друку зьявіўся ліст ***Рыгора Бухаўца*** *(72 гады),* механізатара зь вёскі Крупіца Менскага раёна. Ён ужо хворы, жонка — інвалід. Усё жыцьцё добра працаваў, нават быў узнагароджаны тэлевізарам за перамогу ў рэспубліканскім спаборніцтве. А зараз просіць калгаснае кіраўніцтва прадаць сена для каровы, бо сам ня можа махаць касой, ды толькі тэхніка выкарыстоўваецца для калгаснага чынавенства, а не для такіх, як аўтар ліста. Год таму ён здолеў купіць таго сена за 50 мільёнаў рублёў, прадаўшы цялушку ды дадаўшы яшчэ пэнсію. Ды сена прадаў не калгас, а будаўнік, зь якім тым сенам разьлічыліся за зробленую працу. „Людзі, як цяжка...”, — заканчвае свой ліст гэты працаўнік-беларус.

*23 лістапада. Горадня.* У Ленінскім судзе завяршыліся разгляды адміністрацыйных справаў удзельнікаў акцыі „Пераменаў!” 12 лістапада. Асуджана 12 чалавек: ***Андрэй Мялешка*** *(штраф 170 мін. з.)*; ***Сьвятлана Нех*** *(штраф 150 мін. з.)*; ***Вадзім Саранчукоў*** *(папярэджаньне)*; ***Андрэй Мельнікаў*** *(арт.167.1 КаАП — штраф 20 мін.з.)*; ***Алесь Лашкоўскі*** *(арт.167.1 КаАП — штраф 30 мін.з.)*; ***Вольга Іванова*** *(арт.167.1 КаАП — штраф 25 мін. з.)*; **Іна Мялешка** *(арт.167.1 КаАП — папярэджаньне)*; ***Натальля Капцэвіч*** *(арт.167. 1 КаАП — штраф 30 мін.з.)*; ***Вольга Філіповіч*** *(арт. 167.1 КаАП — папярэджаньне)*; ***Алена Машкала*** *(арт.167. 1 КаАП — штраф 20 мін.з.)*; ***Сяргей Клімук*** *(арт.167.1 КаАП — штраф 30 мін.з.)*; ***Дзяніс Міхальчык*** *(арт.167.1 КаАП — штраф 30 мін.з.).*

*27 лістапада, Віцебск.* Суды над сябрамі *Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ* адбываліся без прысутнасьці абвінавачаных. За ўдзел 8-га верасьня ў пікеце ў гонар *Беларускай Вайсковай Славы* ***Зьміцер Піменаў*** аштрафаваны на 20 мінімальных заробкаў (мін.з.) — гэта 65 даляраў ЗША; ***Юры Карпаў*** — на 5 мін.з. ***Барыс Хамайда*** атрымаў папярэджаньне. Такім чынам *З.Піменаў* за апошнія тры месяцы „зарабіў” палітычны капітал у 170 мін.з. (552 $) і крымінальную справу; *Барыс Хамайда* — 300 штрафных „мінімалак” (974 $); ***Уладзімер Плешчанка*** — 150 „мінімалак” (487 $).

*27 лістапада* ў судзе Кастрычніцкага раёну Віцебска разгледзелі адміністрацыйныя справы ***Сяргея Шапіры, Уладзімера Патоцкага, Юры Мельнікава*** (арганізацыя несанкцыянаванага пікету). Усе атрымалі папярэджаньне.

*28 лістапада ў Барысаве* на адміністрацыйную камісію па справах непаўнагадовых (за ўдзел у пікеце) выклікалі братоў ***Зьміцера*** і ***Міхася Кузьняцовых*** *з бацькамі.* Падлеткаў аштрафавалі (Міхася — на 3 тысячы рублёў, Зьміцера — на 2 тысячы).

*29 лістапада, Віцебск.* Міліцыя зноў затрымала ***Барыса Хамайду***, які зьбіраў у цэнтры горада подпісы за абарону незалежнасьці Беларусі. Яго з плякатам на грудзях правялі да пастарунку па вуліцах, а потым склалі пратакол за „несанкцыянаванае пікетаваньне”.

*30 лістапада, Віцебск.* ***Барыс Хамайда*** ў дзень падпісаньня „саюзных” дакумантаў працягваў зьбіраць подпісы за Незалежнасьць Беларусі ў цэнтры Віцебска. Яго затрымалі, сканфіскавалі ўсе подпісы, дакуманты і блянкі, склалі пратакол і адпусьцілі да суду.

*30 лістапада Менск* нагадваў акупаваную сталіцу. На кожным завулку дзяжурыў міліцыянт. Асаблівага гонару прыдбаў бюст Ф. Дзяржынскаму, які месьціцца насупраць КДБ на праспэкце Францішка Скарыны. Усюды бачыліся расейскія трохколерныя сьцяжкі. Акупацыя — і кропка.

*Камэнтар SANA: Расея, прадчуваючы сыход саўгаснага начальніка, імкнецца захаваць на Беларусі сваю прысутнасьць у выглядзе часовай вайсковай групоўкі. Але гэта не Чачня, і сілай тут не пераможаш. Людзі ўсё больш не давяраюць сёньняшняму рэжыму. Супроць „савецка-рэспубліканскага” ладу набірае моц хваля незадавальненьня.*

*Выглядае, што менавіта парляманцкая рэспубліка ёсьць альтэрнатывай таталітарнаму рэжыму. У нас не Амэрыка, дзе можна на выбарах зьмяняць прэзыдэнтаў. У нас або савецкі ўсеагульны калгас, або парляманцкі грамадзкі кампраміс. Апошні варыянт — выйсьце для ўсіх. Народны парлямант можа перахапіць уладу ў свае рукі і прызначыць цьвёрды ўрад, справядлівы Канстытуцыйны Суд і сваяго прадстаўніка для зносінаў са сьветам. Народны Фронт быў ад самага пачатку за неўжываньне пасады прэзыдэнта менавіта на Беларусі. І вось гэтая перасьцярога цалкам сябе спраўдзіла. Маем, што маем.*

■ *Лістапад.* Зьбіраюцца зачыніць беларускі ТЮГ і перарабіць яго на рускі тэатр. Ужо зьявіліся „ініцыятары” агучваньня „ідэі” (акторка **Сьвятлана Кліменка** *і інш.*)

■ Камітэт ААН па барацьбе з катаваньнямі разгледзеў трэцюю пэрыядычную справаздачу па Беларусі. Камітэт выказаў занепакоенасьць з нагоды:

*„Пагаршэньня сітуацыі з правамі чалавека ў Беларусі з часу падпісаньня справаздачы ў 1992 г. Не спыняецца наступ на свабоду самавыяўленьня, г.зн. абмяжоўваецца незалежнасьць прэсы і права на мірныя сходы, што стварае перашкоды для выкананьня палажэньняў Канвэнцыі;*

*Адсутнічае фармулёўка аб тым, што такое „катаваньне” у адпаведнасьці з артыкуламі 1 Канвэнцыі...*

*Пастаянна паступаюць заявы аб ўжываньні катаваньняў ды іншых формаў гвалту, жорсткасьці і пакараньня з боку дзяржаўных асобаў альбо пры іхным папушчальніцтве, накіраваных супраць палітычных апанэнтаў рэжыму і мірных дэманстрантаў: выкраданьне, зьбіцьцё ды іншыя дзеяньні, што супярэчаць тэксту Канвэнцыі;*

*Пракуроры залежаць ад выканаўчай ўлады, асабліва ва ўмовах, калі пракурор мае права кантролю за працягласьцю затрыманьня асобаў у папярэднім зьняволеньні, якое нярэдка дасягае 18 месяцаў;*

*Нежаданьня чыноўнікаў праводзіць хуткае бесстаронняе і*

*паўнавартаснае рассьледваньне шматлікіх выпадкаў катаваньняў, аб якіх рэгулярна дакладваецца ўладам, а таксама іх нежаданьне называць вінаватых у адпаведнасьці з артыкуламі 12 і 13 Канвэнцыі;*

*Адсутнічае рэальная незалежная судовая ўлада, у той час як прэзыдэнт краіны карыстаецца выключным правам прызначаць і звальняць большасьць суддзяў, якія перад прызначэньнем праходзяць пэўны выпрабавальны тэрмін і ня маюць неабходных гарантыяў;*

*Дэкрэту прэзыдэнта №12, які абмяжоўвае незалежнасьць адвакатуры, падпарадкоўваючы яе Міністэрству юстыцыі праз увядзеньне працэдуры абавязкавага сяброўства ў дзяржаўнай калегіі адвакатаў, што адкрыта супярэчыць Асноўным прынцыпам ААН аб ролі адвакатаў;*

*Перапоўненасьці, неякаснага харчаваньня, незахаваньня асноўных нормаў гігіены і адсутнасьці неабходнай мэдычнай дапамогі, а таксама распаўсюджанасьці сухотаў ў турмах і СІЗО;*

*Працягваецца прымяненьне сьмяротнага пакараньня, дзейнічае неадэкватная працэдура абскарджаньня, адсутнічае інфармацыя аб зьняволеных і адсутнічае права ў сваякоў доступу да целаў расстраляных, не праводзяцца рассьледваньні выпадкаў катаваньняў і жорсткага абыходжаньня ва ўвязьненьні.”*

## *СЬНЕЖАНЬ (2000 год)*

*На пачатак сьнежня* звыш 130 тысячаў подпісаў пад патрабаваньнем годнага заробку настаўнікам сабраў прафсаюз адукацыі і навукі. Зборшчыкі подпісаў у многіх рэгіёнах краіны зьведалі на сабе супрацьдзеяньне ўладаў. У Мсьціслаunion, напрыклад, забаранілі зьбіраць подпісы, а ўжо сабраныя — адабралі. Аналягічныя факты зарэгістраваныя ў Касьцюковічах і ў Круглянскім раёне.

*1 сьнежня* Жодзінскі суд разгледзеў справу сябра рускай фашыстоўскай арганізацыі РНЕ Сяргея Маклака, які 8 кастрычніка падчас дэманстрацыі ўдарыў кулаком у твар ***Алеся Лапіцкага*** — актыўнага ўдзельніка акцыі. А. Лапіцкі напісаў заяву ў суд і патрабаваў узбуджэньня крымінальнай справы, аднак справу перавялі ў адміністрацыйную.

Падчас разгляду справы прыналежнасьць С. Маклака да РНЕ была даказана, але ў заключнай пастанове суда гэты факт ня быў адлюстраваны. Суд не зьвярнуў увагі на той факт, што сям’і Лапіцкіх (бацька Алеся — Аляксей Лапіцкі — старшыня мясцовай арганізацыі ТБМ) неаднаразова пагражалі расправай „брытагаловыя”, а пасьля пагрозаў разьбілі званок у кватэры, кідалі ў вокны яйкамі, спрабавалі падпаліць кватэру. Жодзінскага „брытагаловага” пакаралі штрафам на карысьць дзяржавы — адзін мінімальны заробак.

*Сьнежань.* Рашэньнем Аблвыканкама адзін зь лепшых працаўнікоў сістэмы прафадукацыі дырэктар ПТУ №49 Горадні дэпутат гарсавета ***Павел Касьцюкевіч*** звольнены з працы. Афіцыйная прычына — 21 лістапада 2000 г. скончыўся кантракт. На самой справе — за ігнараваньне установак улады падчас мінулых „выбараў” у лукашэнкаву „палату прадстаўнікоў”. Перад „выбарамі” П. Касьцюковіч ня стаў выкарыстоўваць шантаж і пагрозы. Сам ён галасаваць не пайшоў.

Калектыў вучэльні не пагадзіўся са звальненьнем дырэктара і накіраваў лісты ў інстанцыі горада і вобласьці. Калі ініцыятыўная група паспрабавала трапіць на прыём да намесьніка старшыні аблвыканкама **Марыі Біруковай** *(расейка, вядомая ў Горадні сваім беларусафобствам і нянавісьцю да беларусаў),* тая не пусьціла іх далей прыёмнай.

*Сьнежань.* „Лідзкі раённы выканаўчы камітэт…не дае згоды на выданьне і распаўсюджваньне ў раёне грамадска-інфармацыйнай газэты *„Лідзкі павет”.* Пры гэтым выканкам ніяк не абгрунтаваў сваё рашэньне. Між тым арт. 10 Закона аб друку прадугледжвае толькі ўзгадненьне разьмяшчэньня сродку масавай інфармацыі, а не атрыманьне згоды на выданьне газэты.

***Перасьлед за малітву.*** *Сьнежань. Горадня.* Напярэдадні Новага году была асуджаная жыхарка Горадні ***Марыя Мацко*** за тое, што малілася ў грамадзкім месцы. Пры гэтым яна ніякага закону не парушыла, а толькі скарысталася сваім канстытуцыйным правам. Аднак, нягледзячы на гэта, ёй быў прысуджаны штраф у памеры аднаго мінімальнага заробку. Малілася сп. Мацко на месцы *Фары Вітаўта*, якая была ўзарваная бальшавікамі ў 1961 годзе. Летась 29 лістапада на месцы Фары быў усталяваны крыж-напамін. Празь дзень крыж быў зьнішчаны. Але вернікі вырашылі штодзень да надыходу *Калядаў* прыходзіць на гэтае месца і маліцца. Гарадскія ўлады адразу ж пачалі чыніць перашкоды вернікам. Падчас малітвы міліцыянты на машыне спрабавалі наехаць на групу вернікаў. Штодзень маленькія крыжыкі, зьнічкі, што прыносілі вернікі, міліцыянты ўтоптвалі ў зямлю. 10 сьнежня сп. Мацко выклікалі ў міліцыю «на размову», а 27 сьнежня – на Камісію па адміністрацыйных справах. ***Найбольшае абурэньне чальцоў камісіі выклікала тое, што набажэнствы на месцы Фары вяліся па-беларуску.*** Але вернікі ўсё ж працягвалі зьбірацца, каб маліцца за аднаўленьне храма.

*Сьнежань. Смалявічы.* Жыхары Смалявічаў ня могуць знайсьці дзіцячы садок, дзе існавалі б беларускамоўныя групы.

Перад бацькамі стаіць яшчэ праблема. Яны хочуць, каб дзеці вучыліся ў беларускім клясе. Але ***беларускіх школаў у Смалявічах няма***. Бацькі прапануюць аб’ядноцца ўсім, хто жадае даць дзецям адукацыю на роднай мове.

*Сьнежань. Ворша.* Аршанскі сухотны шпіталь асуджаных перагружаны ўдвая. Хворыя з адкрытай формай сухотаў утрымліваюцца ў агульных палатах. Цяпер заражэньне палачкай Коха пагражае не толькі тым, хто адбывае пакараньне, але і тым, чыя віна яшчэ не даказаная. Акрамя сухотаў, у тутэйшага кантынгенту выяўляюцца яшчэ і пранцы, а таксама іншыя хваробы. Незайздросны лёс зьняволеных ускладняецца бядотным станам турэмнай медыцыны. Таму верагоднасьць летальнага зыходу хворых застаецца тут надзвычай высокай.

***Гэта саветы.*** *Сьнежань. Менск.* Тры месяцы шукаў ***Кастусь Кашэль*** для свайго дзіцяці беларускамоўны садок. Так і не знайшоў. У Менску іх ужо даўно няма.

Аднойчы падчас выбарчай кампаніі на бацькоўскі сход школы завітала прадстаўніца Міністэрства адукацыі і адначасова давераная асоба дэпутаткі лукашэнкавай „палаты” В.М.Самусевай **Сьвятлана Вароніна**.

Пасьля агітацыйнай прамовы сп.Варонінай Кастусь Кашэль прапанаваў уключыць у парадак дня пытаньне аб забесьпячэньні рэальнага статуса групы №6 як беларускамоўнай.

Дэманструючы веданьне беларускай мовы, сп.Вароніна сказала: „Назьбіраеце 22 дзяцей для беларускай групы, тады і адчынім яе, а не — дык шукайце выхавацеляў, настаўнікаў, толькі ўсё самі і фінансуйце.” Потым, ужо па-расейску, распавяла бацькам, што яна „тоже наполовіну беларуска”, што „в 1992-1993 гадах іскусственно насаждался белорусскій язык” і яна спадзяецца, што „это время прошло і больше не вернется”. Усе прысутныя з гэтым маўкліва пагадзіліся.

*5 сьнежня. Менск.* Інвалід І-й групы ***Валеры Кішчук*** выказаў маўклівы пратэст, седзячы ў інваліднай калясцы каля будынку Менгарвыканкаму. Ён вымушаны пакутваць, жывучы ў нечалавечых бытавых умовах пры адсутнасьці належных сацыяльных гарантыяў.

Па загадзе чыноўнікаў гарвыканкаму на сп. Кішчука напалі два супрацоўнікі міліцыі, апранутыя ў цывільнае. Яны спрабавалі выкінуць В.Кішчука з інваліднай каляскі. Калі сп. Кішчук спытаў, хто яны і што ім трэба, у адказ пачуў брудную лаянку і пагрозу пабіць яго.

Валеры Кішчук лічыць гэты выпадак зьдзекам уладаў над ім як асобай і грамадзянінам.

*Сьнежань.* Прадстаўнікі беларускіх пратэстанцкіх абшчынаў выказалі публічны пратэст супраць трансляцыі па БТ 40-хвіліннага фільму „Экспансія”. Фільм, у якім выказваецца і прапагандуецца

нэгатыўнае стаўленьне да пратэстанцтва, дэманстраваўся па БТ двойчы *(26 кастрычніка і 2 лістапада).* Да пратэсту далучыліся кіраўнікі пратэстанцкіх цэркваў Украіны і Расеі.

*7 сьнежня.* Суд *Слуцку* і *Слуцкага раёну* разгледзеў адміністрацыйную справу вайсковага пэнсіянера ***Аляксандра Катлярова***, якога абвінавачвалі ў арганізацыі несанкцыянаванага мітынгу 8 кастрычніка ў Слуцку. Суддзя **Натальля Халадок** вынесла рашэньне — штраф *(150 мін.з.)* А. Катлярову пагражаюць канфіскацыяй маёмасьці у тым выпадку, калі ён ня выплаціць штраф на працягу 2-х сутак. Гэта яўнае парушэньне закону. (Згодна арт.286 КаАП, штраф павінен быць выплачаны не пазьней за 15 дзён, пасьля ўручэньня судовай пастановы. А згодна з арт.287 КаАП, маёмасьць канфіскуецца толькі тады, калі асоба ня мае заработнай платы альбо пэнсіі.) Спадар Катляроў атрымлівае пэнсію. У адпаведнасьці з правіламі Грамадзянскага працэсуальнага кодэксу, накладзены штраф павінен быць вылічаны з ягонай пэнсіі (па 20 адсоткаў штомесяц).

А. Катляроў будзе абскарджваць судовае рашэньне ў Менскім абласным судзе.

*9 сьнежня. Горадня.* На вуліцы Савецкай моладзь правяла несанкцыянаваны пікет у абарону правоў чалавека. У пікеце прынялі ўдзел 8 чалавек з плякатамі: ***Студэнты супраць дыктатуры"; „Маем права на людзкае жыцьцё!"; „Маем права на свабоду!"***.

Пікет працягваўся 30 хвілінаў. Быў спынены міліцыянтамі, якія затрымалі пяць чалавек: чатырох удзельнікаў пікету і аднаго выпадковага грамадзяніна. Складзеныя пратаколы на ***Сьвятлану Нех*** (намесьнік старшыні „Маладой Грамады") і ***Дзяніса Міхальчыка*** (старшыню студэнцкага прафсаюза). Была затрымана і карэспандэнтка газэты *„Пагоня"* ***Алеся Сідлярэвіч*** і грамадзянін Польшчы (прадстаўнік польскай партыі сацыялістаў), якога абшукалі і засьвяцілі фатаграфічную стужку.

*9 сьнежня ў Берасьці* былі забароненыя чатыры з пяці пікетаў, прысьвечаных угодкам абвяшчэньня Ўсеагульнай дэклярацыі правоў чалавека.

*Напачатку сьнежня* стала вядома, што вязень Магілёўскага СІЗА ***Зьміцер Абадоўскі*** спыніў галадоўку пасьля таго, як пачаў рэзка губляць зрок і слых і яго перавялі з карцэру ў звычайную камэру.

Гэта ня першая ягоная спроба прыцягнуць увагу да сваёй справы. Ён знаходзіцца пад вартай 17 месяцаў. За гэты час доказаў ягонай віны ў згвалтаваньні прадстаўлена не было.

Бацька З. Абадоўскага — магілёўскі праваабаронца Сяргей Абадоўскі — сцьвярджае, што ягонага сына абвінавацілі фальшыва, спэцыяльна, каб палітычна паўплываць на пазыцыю бацькі.

*10 сьнежня. Віцебск.* Затрыманыя ***Алена Залеская***, ***Сяргей Васенка***, ***Анатоль Захараў***, ***Дзяніс Мускоў***. Пікетоўшчыкаў зацягнулі ў машыну людзі ў цывільным і даставілі ў РАУС Чыгуначнага раёну Віцебска. На іх былі складзеныя пратаколы па арт. 167.1 КаАП *(арганізацыя несанкцыянаванага пікету*).

*12 сьнежня ў Асіповічах* у прыватную кватэру уварваліся міліцыянты, сярод якіх быў пракурор Асіповіцкага раёну **Сяргей Бабакоў**. У гэты час там знаходзіліся ***Мікалай Тамашоў*** (рэдактар рэгіянальнай газэты „*Панарама"*) і ***Ігар Сімбіраў*** (адзін з аўтараў газэты). Міліцыянты прад'явілі ордэр, сказалі, што па факце надрукаванага ў газэце „паклёпу" узбуджаная крымінальная справа і пачаліператрус. (Яны не ўдакладнілі, у якім артыкуле быў знойдзены „паклёп".)

Падчас ператрусу міліцыянты зьневажалі І.Сімбірава, называлі „клоунам", а старэйшы лейтэнант **Юры Грабін**, заламаўшы яму руку, разьбіў пераносьсе, вывіхнуў палец і пабіў гадзіньнік. У выніку ператрусу ***было канфіскавана больш за 100 дакумантаў, у тым ліку і 51 аркуш з апавяданьнямі. Кватэру апячаталі.*** І.Сімбіраў адмовіўся адказваць на пытаньні без прысутнасьці адваката.

*Сьнежань.* ***Ільля Цэцура*** (1978 г. нараджэньня) прыехаў у Менск на канцэрт, а яго зьбілі дубінкамі.

Калі юнак з сябрамі пасьля прыніжальнага ператрусу ішоў на канцэрт праз жалезную агарожу, яго міліцыянты вырвалі з чаргі. Без усялякай нагоды. Калі ён спытаў, чаму ня можна ісьці на канцэрт, амапавец адказаў: „Таму што п'яны." Ільля патрабаваў, каб яго адвезьлі на праверку. „Стой і маўчы,"— атрымаў у адказ.

Такім чынам „адсеялі" чалавек 20, падагналі аўтобус і загналі іх туды. На пратэсты міліцыянты адказалі ўдарамі дубінак і кулакоў, матам. На некаторых надзелі наручнікі. Маладых людзей прывезьлі ў пастарунак на Старавіленскую,52, дзе пратрымалі да 23 гадзінаў. На Ільлю склалі пратакол, што нібыта ён лаяўся і лез на людзей. На просьбу патэлефанаваць дадому міліцыянт адказаў: „Будзеш жыць у Амэрыцы, тады будзеш тэлефанаваць.Можа, табе яшчэ й адваката трэба?!" Міліцыя, АМАП ды іншыя структуры не баяцца адказнасьці за тое, што з чалавекам абыходзяцца горш, чым з жывёлай.

*Сьнежань.* БТ не пускае ў эфір беларускую песьню. Кіраўніцтва Нацыянальнай Дзяржаўнай Тэлерадыёкампаніі адмовілася правесьці


www.ZAKAT.org

***Дзяўчына з кветкамі. Горадня.***

запіс і трансляцыю на БТ вечарыны беларускай песьні, якая адбылася 19 сьнежня ў зале Белдзяржкансэрваторыі. На канцэрце, прысьвечаным 30-годдзю творчай дзейнасьці беларускіх кампазітараў *Валянціны Сярых* і *Алега Чыркуна*, вядомыя сьпевакі выконвалі мэлёдыі на вершы *Ніла Гілевіча, Рыгора Барадуліна, Генадзя Бураўкіна, Валянціны Акулавай, Віктара Шніпа, Міхаіла Ясеня.*

*Сьнежань.* Са Звароту Грамадзкага аб'яднаньня *„Таварыства Беларускай Мовы імя Францішка Скарыны":* „Распрацаваны праект „Закону аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь", які без усялякага грамадзкага абмеркаваньня рыхтуецца да прыняцьця Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу на пачатку 2001 г. Згодна з артыкулам №5 гэтага праекту, „Граждане имеют право на выбор языка обучения и воспитания в пределах возможностей, предоставляемых системой образования".На практыцы гэта будзе азначаць, што калі ў населеным пункце няма беларускамоўнай навучальнай установы,

нават і ня думай пра тое, каб патрабаваць выкананьня канстытуцыйнага права выбару мовы навучаньня і выхаваньня. Распрацоўшчыкі праекта, як і ў часы Расейскай імпэрыі, не вызначаюць беларускі народ як нацыю, акрэсьліваючы яго як нацыянальную супольнасьць. Вось так, дарагія суайчыньнікі, тыя правы, якія раней прадстаўляліся нацыянальнай меншасьці, зараз будуць належаць „нацыянальнай супольнасьці"беларусаў. Таму мы зьвяртаемся да ўсіх грамадзянаў, патрыётаў і грамадзкіх арганізацыяў, якім неабыякавы лёс беларускай мовы, перашкодзіць Палаце прадстаўнікоў прыняць антызаконны „закон", якім мяркуецца цалкам зьнішчыць беларускамоўную адукацыю."

*Сьнежань.* Сутнасць новага праекта закона аб адукацыі заключаецца ў тым, каб пахаваць „ня толькі беларускамоўную, але і любую нерускамоўную адукацыю". Так пракамэнтаваў дакумант, распрацаваны Нацыянальным цэнтрам законатворчай дзейнасці Беларусі, старшыня *ТБМ* ***Алег Трусаў***.

Грамадскасць, лічыць ён, павінна зрабіць усё, каб гэты драконаўскі праект ня быў прыняты, паколькі новы закон паставіць крыж на ідэі стварэння Беларускага нацыянальнага ўнівэрсытэту і зьнішчыць рэшткі беларускамоўнай школы. Яго прыняцьце дазволіць чыноўнікам закрыць любы беларускамоўны кляс пад маркай „адсутнасці магчымасьцяў".

Акрамя таго, як адзначаецца ў фінансава-эканамічным абгрунтаваньні расходаў, якое прыкладаецца да праекта, увядзеньне закона ў дзеяньне патрабуе каля 7 мільярдаў рублёў дадатковых расходаў бюджэту.

„Такім чынам, — заўважыў старшыня *ТБМ*, — зьнішчэньне беларускай мовы будзе адбывацца не бясплатна, а за грошы падаткаплацельшчыкаў."

*28-29 сьнежня. Магілёў.* Стыхійная дэманстрацыя пратэсту працоўных магілёўскага аб'яднаньня „Хімвалакно" ў зьвязку з невыдачай заробку натхніла іншых.

Увечары 28 сьнежня каля 500 рабочых аўтазаводу, не атрымаўшы чаканай зарплаты, заблякавалі рух аўтатранспарту на Віцебскім праспэкце. На працягу трох гадзінаў яны перагароджвалі дарогу, прапускаючы толькі машыны „хуткай дапамогі".

Людзі вымушаныя былі пакінуць тралейбусы і аўтобусы.

Рабочыя былі настолькі ўзрушаныя, што назаўтра грошы на зарплату знайшліся.

*29-30 сьнежня. Берасьце.* Адміністрацыя „Цветатрону" працягвае вайну з прафсаюзам. Нягледзячы на пратэст пракуратуры Маскоўскага раёну Берасьця, 29 сьнежня на прадпрыемства не дапусцілі старшыню прафкаму работнікаў радыёэлектроннай прамысловасці ***Зінаіду Міхнюк*** і яе намесніцу ***Лілію Сьветкіну***. У іх забралі асноўныя пропускі і прапанавалі праходзіць на завод па разавых пропусках, хоць яны абедзьве працуюць на «ветатроне» з 1985 года. Апроч таго канцылярскай службе дадзена ўказаньне не прымаць ад РЭПаўцаў ніякіх папераў.

Свае паводзіны адміністрацыя матывавала проста: у нас няма пацьверджаньня, што на заводзе існуе пярвічная арганізацыя РЭП. Але РЭП жыве і існуе па зацьверджаным калектыўным дагаворы. Прафкам мае сваю пячатку і пасьведчаньне аб рэгістрацыі. У сярэдзіне сьнежня адбылася прафсаюзная канфэрэнцыя, дзе зацьверджаны новы склад і давыбраныя сябры прафкаму пярвічнай арганізацыі РЭП.

Спадарыня Міхнюк не здалася: яна апячатала кабінэт прафкаму, які ёй прапанавалі вызваліць без усялякіх пратаколаў. Рыхтуецца іскавая заява ў суд.

* * *

## *ДАДАТАК (2000 год)*

*Ганцавічы. У 2000 годзе* суддзя Ганцавіцкага суду сп.**Ваўчок** „асудзіў" ***Пятра Гузаеўскага*** паводле артыкулу 172, ч.**8** КАП, у якім толькі **3** часткі.

Спадар Гузаеўскі вырашыў выдаць газэту „*Наша Ганцаўшчына*" накладам 299 асобнікаў, сабраў нататкі пра жыцьцё Ганцаўшчыны, зрабіў перадрукі цэнтральнай прэсы, падабраў вершы. Зрабіў пару раздрукоўак. Прынтэр пакідаў чорныя плямы на ўсіх трох старонках. Аднак выкінуць брак сп.Гузаеўскі не пасьпеў: у кватэру ўварваліся міліцыянты. Участковы **Рабцэвіч** аддаў загад забраць у кватэры ўсё: кампутар, прынтэр, мадэм, дыскеты, бракаваныя асобнікі газэты. Ніякіх пратаколаў Рабцэвіч і ягоныя хаўрусьнікі не складалі. Праз некалькі дзён пасьля скаргі ў пракуратуру тэхніку сп. Гузаеўскаму вярнулі. Пракуратура спрацавала, паводле закону. А вось суддзя Ваўчок не зьвярнуў увагі на тое, што закон не патрабуе рэгістрацыі выданьня накладам, менш за 300 асобнікаў — сп. Гузаеўскага аштрафавалі на 2 мінімальныя заробкі.

*У студзені 2000 г.* 18-гадовы навучэнец ПТВ *у Баранавічах* ***Дзяніс Грыговіч*** быў затрыманы ўчастковым інспэктарам **Шэметам** па падазрэньні ў біцьці шыбаў. 5 дзён Дзяніса трымалі ў пастарунку, дзе жорстка зьбівалі й патрабавалі прызнацца. Пасьля вызваленьня Дз. Грыговіч лячыўся ў шпіталі. Праз два тыдні інспэктар Шэмет абвінаваціў Грыговіча ў падпале дзьвярэй ягонай кватэры ў ноч з 3-га на 4-га лютага 2000 г. Сям'я Дзяніса сцьвярджала, што ўвечары і ўночы падпалу Дзяніс быў дома. Авднак сьледзтва мела сваю думку. У выніку Дз. Грыговіч прабыў у СІЗА 10 месяцаў.

Ягоная маці паскардзілася ў БГК. Гэтай справай заняўся грамадзкі абаронца М.Чыжыкаў. Ён шмат разоў падаваў скаргі ў пракуратуру на гвалт, пагрозы, зьбіцьцё, якія стасаваліся сьледзтвам. Абласны суд пад старшынствам У. Вайтэхоўскага вынес апраўдальны прысуд, хаця пракурор патрабаваў (пры нізкай якасьці сьледзтва) 15 гадоў зьняволеньня.

Хадайніцтва М.Чыжыкава аб вынясеньні прыватнага вызначэньня суду ў адрас Шэмета й іншых міліцыянтаў задаволенае не было.

*Доўск.* Жыхар мястэчка *Доўск* ***Ігар Раманаў*** з 31 ліпеня 2000 г., паводле рашэньня суддзі Цэнтральнага раёну Гомеля **Я**. **Парэмскага** адседзеў у ізалятары часовага затрыманьня 7 сутак (за правядзеньне 27 ліпеня несанкцыянаванага пікету ля Гомельскага аблвыканкаму, дзе І.Раманаў стаяў з плякатам „***НЕ — фашызму ў Беларусі!***".

*31 ліпеня 2000 г., Маладэчна.* ***Валеры Чаеўскі*** ў стане алькагольнага ап'яненьня ішоў дахаты. Яго затрымалі міліцыянты, завялі ў пастарунак, склалі пратакол аб дробным хуліганстве. Чаеўскі пасаромеўся назваць сваё прозьвішча і назваўся Івановым. Пасьля праверкі зьвестак, яго завялі ў выцьвярэзьнік, дзе прапанавалі разуцца. Чаеўскі папрасіў, каб пусьцілі, патлумачыўшы, што назваўся „Івановым", бо не хацеў, каб пра тое, што ён напіўся і быў п'яны, даведаліся дзеці.

А восьмай вечара да яго ў камэру зайшоў памочнік Дзяжурнага **Барысевіч** і запытаўся прозьвішча. Чаеўскі зноў схлусіў. Барысевіч з калегамі прывязалі яго да ложка й зьбілі. Праз пару гадзінаў Чаеўскага разьвязалі, перавялі ў дзяжурную частку й запыталі прозьвішча. Чаеўскі назваў зьвесткі свайго брата. Яго жорстка зьбілі. У зьбіцьці ўдзельнічаў і дзяжурны выцьвярэзьніка **Гасьціловіч**, і ягоны намесьнік Барысевіч, і яшчэ колькі міліцыянтаў. Зьбітага завалаклі ў камэру і зьвязалі „ластаўкай" на паўгадзіны. Раніцай яго зноў біў Барысевіч. А восьмай раніцы з Чаеўскага ўзялі штраф і адпусьцілі дахаты. Адразу ж ён выклікаў *хуткую дапамогу*, якая канстатавала падвойны разрыў касы. Касу выдалілі, было моцнае ўнутранае кровазьліцьцё, ад якога Чаеўскі ледзь ні сканаў.

З дапамогай БГК была ўзбуджана крымінальная справа, у выніку якой Барысевіч асуджаны на 4 гады пазбаўленьня волі. Гасьціловіч і іншыя міліцыянеры, якія таксама ўдзельнічалі ў зьбіцьці Чаеўскага, засталіся беспакаранымі.

*22 верасьня 2000 г.* раніцай на занятку ў ПТВ *у Бабруйску* прыехалі двое ў цывільным і забралі з сабой непаўнагадовага ***Дзяніса Селівоніка***. 12 гадзінаў запар яго дапытвалі ў Першамайскім РАУС без адваката, педагога й іншых законных прадстаўнікоў. На просьбы патэлефанаваць бацькам міліцыянты не рэагавалі. Выкладчыкі вучэльні таксама не паведамілі бацькам пра затрыманьне.

Дзяніс хворы на астму, і падчас допыту ён страціў прытомнасьць. Яму зрабілі нейкі ўкол, пасьля чаго ён стаў кепска арыентавацца і не ўцяміў, што падпісвае. (Аказалася, што падпісаў дакументы, якія дазволілі затрымаць яго на тры ночы).

Міліцыянты патэлефанавалі бацькам хлопца і сказалі, што ён затрыманы ў якасьці сьведкі, а сьведкам „адвакат не паложан”.

Дзяніса зьмясьцілі ў КПЗ, дзе ўдарылі палкай па галаве. У камэры ўтрымліваліся дарослыя зьняволеныя, сярод якіх быў хворы з адкрытай формай тубэркулёзу (сухотаў). Ён і заразіў Дзяніса. Праз тры дні хлопца выпусьцілі. Цяпер ён лечыцца ў *тубдыспансэры*.

БГК накіраваў запыт у гарадзкую пракуратуру наконт законнасьці дзеяньняў міліцыі.

***(Інфармацыйная Камісія Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыіі — БНФ і прэс-служба БНФ.** По матэрыялах Камісіі, СМІ, „Вясны-96”, SANA)*

# БЕЛАРУСЫ ПАД АКУПАЦЫЯЙ:

## *СПОВЕДЗЬ НЕАБЫЯКАВАГА ЧАЛАВЕКА АЛЬБО ШЛЯХ ДА БЕЛАРУСІ*

* * *

### *1. Першы наказ бацькі*

Дзяцінства. Што можа быць сьвятлей? Цяпло і сьвятло ягонае грэе, вядзе нас усё жыцьцё. Сьветлымі постацямі ў ім застаюцца бацькі.

Мой бацька, Дзімітры Куцанкоў, нарадзіўся ў 1903-м годзе ў вёсцы *Акшынка Веткаўскага раёну Гомельскай вобласьці*. З трох год застаўся бяз бацькі, таму змалку служыў у пана пастушком. Быў аднагодкам з маладым паничом. Як таго паслалі ў школу, то рослага і крэпкага Міцю адправілі разам зь ім, але не вучыцца, а даглядаць, абараняць паніча, калі што. Паніч быў лянівы. Міця замест паніча рашаў задачы, выконваў заданьні. Настаўнік данёс пану. А той загадаў хлопца залічыць у школу. Так Міця скончыў сем клясаў.

З другога курсу рабфака сыйшоў, трэ’ было дапамагаць маці гадаваць меншых дзяцей. Вярнуўся ў *Акшынку*. У 1931-м уступіў у камсамол. Раскулачваў. Агітаваў сялян уступаць у калгасы. Працаваў рахункаводам. У 1934-м стаў камуністам („за родину и Сталина”). Прайшоў усю вайну. Пасьля перамогі асеў у мястэчку („гарпасёлку”) *Касьцюкоўка,* што пад Гомлем. Там зьявілася на сьвет і я.

Маці мая, Матруна Міронаўна, з 1913 году, зь вёскі *Крыўск Буда-Кашалёўскага раёну.* У вайну аўдавела. Мела дзьвух дачок. За працаю заўсёды ціхенька сьпявала і вечна шкадавала часу на адпачынак і сон. Нават хварэць ёй не было калі. Да нас з *Акшынкі* перабраліся двое бацькавых сыноў.

На бяседы ў сьвяты ў нашу хату прыходзілі суседзі. Гарэлкі пілі ня шмат. Жанчыны да чарак не дакраналіся. Часам толькі прыгублівалі. Застольле было сьціплым: разварыстая бульба, агуркі, капуста, шкваркі зь яйкамі, лусткі чорнага хлеба, зрэдку — селядзец і каўбаса, халадзец. Затое ўспаміны і песьні ліліся ракой. Бацька зацягваў: *„Ой, арол, ты арол”*. Мужчыны падхоплівалі:

“*Ты лятаеш высако,*
*Ты лятаеш вы-гы-сако, ты бываеш да-га-ляко.*
*А ці быў ты, арол, на маё-го-й старане,*
*А ці чуў ты-гы, арол, аб маёй у-гу-даве?*
*А ці журыцца, ці пяча-га-лі-гі-цца,*
*А ці ў госьці да-га сябе дажыдае-ге-ге-цца?”*

Я была апошнім (малодшым) дзіцём у сям’і. Таму за агульным сталом не сядзела, а недзе ў куточку ці на печы, дзе на жэрдцы ў ільняных вузлах віселі сушаныя дзічкі, яблыкі ды колаты цукар. Як губка, я ўбірала ў сябе кожнае слова. Іх мова і песьні, простага і велічнага аднагалосься, запалі насеньнем у маю душу, каб праз трыццаць гадоў прарасьці.

1956 год. Бацька паставіў мяне перад сабой, абняў і сторга сказаў: „Доч мая, у нас ёсьць дзьве школы: руская і беларуская. Але на Беларусі ўсе вышэйшыя ўстановы перавялі на рускую мову. Калі ты закончыш беларускую школу, то пры паступленьні ў інстытут апынешся не ў аднолькавых умовах з тымі, хто скончыў рускую. А я вельмі хачу, каб ты атрымала вышэйшую адукацыю. Маскалі заселі на пасадах і сьмяюцца з нашае мовы. Мне крыўдна і горка, доч мая, толькі я змушаны аддаць цябе ў рускую школу. Але! Я хачу, каб ты ведала, што ты — БЕЛАРУСКА! Твае бацькі, дзяды і прадзяды — БЕЛАРУСЫ. Таму ты павінна ведаць нашую мову! Накажаш гэта сваім дзецям і ўнукам!” Мне было шэсьць гадоў.

Бацька прымушаў мяне чытаць зь перакладам газэты „Правда” і „Гомельская праўда”. Сварыўся, калі я не магла адрозьніць вершы Янкі Купалы ад вершаў Якуба Коласа. „Гэта гонар нашага народу, нашыя клясыкі! Іх мусіш ведаць, доч мая!”

1960-я гады... Хрушчоў забараніў сялянам трымаць больш адной каровы і двух сьвіней. Матчына маці, баба Ганна, бяз мужа ў Крыўску трымала дзьвюх кароў, быка, пяць сьвіней, паўтары дзясятка авечак, па два тузіны гусей і качак, былі індыкі, повен двор курэй. Дапамагалі ёй дачка, трое ўнукаў і суседзі. Адшаптаўшы малітву, лажылася яна спаць пасьля апоўначы, уздымалася а 4-й раніцы.

Тая палітыка дала плады праз сорак гадоў. Усё змарнавалася. Мой стрыечны брат, яе ўнук, які й цяпер жыве ў яе хаце, стаў алькаголікам.

1962 год. Квітнеў лёзунг: „Кто быстрее перейдет на русский язык, тот первым придет к коммунизму!” Увосень мае сябры прыйшлі ў сваю беларускую школу, а яна ўжо — руская. Гэта нават не абмяркоўвалася...

1964 год. Выйшаў указ, па якому родную мову (беларускую) можна было не вывучаць. Мне непатрэбнымі здаваліся таксама мова ангельская, хімія і геаграфія. Але іх трэба было „вучыць”.

Прайшло 10 год з тае гістарычнае размовы бацькі са мной. У маім атэстаце не было адзнакі па беларускай мове. Красавалася адзіная „тройка” па рускай, тры „чацьвёркі”: па ангельскай мове, хіміі ды геаграфіі. Астатнія адзнакі — „пяцёркі”.

### *2. Другі наказ бацькі*

Мінула яшчэ 10 гадоў. Я ўжо закончыла Беларускі Палітэхнічны інстытут. Працавала архітэктарам. Чатырохгадоваму сыну чытаю казкі з перакладам на родную мову. У кнігарнях дзіцячай літаратуры на беларускай мове амаль няма. Затое горы кніжак на рускай, зь яркімі малюнкамі, што вырывалі вочы. Жыла з сынам у Менску. Як і большасьць, карысталася рускай мовай.

Калі ж нагамі станавілася на бацькоўскі парог, карцела размаўляць на іхняй мове. Але ўжо зьзяла штучнасьць.

Бацька пастарэў і асьлеп. Раней шмат чытаў. Потым адзінай сувязьзю з сусьветам быў стары радыёпрыёмнік. Неяк сказаў мне з пагардаю: „Жывеш у сталіцы, маеш вышэйшую адукацыю, а не вылюднела. Няхай сабе грузін, мурын дрэнна гаворыць па-руску, але няма нічога больш агіднага трасянкі беларуса! І палітыкай ты, доч мая, не цікавішся! Сорамна! Магу дараваць гэта тваёй маці, якая мае чатыры клясы адукацыі, але не табе.

Дык вось што, доч мая, на сконе жыцьця ўзяў мяне сумнеў. Паклаў жыцьцё я, сябе не шкадаваў, за камунізм. А вось задумаўся: ці сапраўды тое, што мы маем, — лепшае. Працуем, як валы, — жывем, як жабракі. Раней можна было пражыць ракой ды лесам. Было і ягад, і грыбоў, зьвяроў і рыбы. За 20 год апошніх зьнікла ўсё. Павыпрасталі рэкі, каб ім шлуньні выпрастала! — Прапала рыба, зьмярцьвелі рэкі. Паасушвалі балоты нашыя, каб ім мазгі асушыла! — Гінуць лясы і ўсё жывое ў іх. Адвучылі людзей працаваць, затое навучылі піць гаручую, каб яны згарэлі! Я гарэлку ў рот упершыню ўзяў у 30 год; вайну прайшоў, то пачаў прыкладацца. А тут глядзіш — пухам не аброс, а ўжо п’яны паўзе, як гразь. І што жахліва — маладзіцы ў чарку заглядаць пачалі. Дык што далей?



*Валянціна Якімовіч сьпявае беларускія песьні ў час падарожжа аўтобусам на Вашынгтон.*

А дзеўкі, бабы агаліліся, пазадзіралі спадніцы вышэй маіх мажлівасьцяў. Дзеля чаго? Мне амаль семдзесят, я стары, сьляпы, але ў душы ж я — парань і не магу спакойна ехаць у аўтобусе. Як жа маладым цярпець? — Няма чаго скардзіцца, што іх гвалтуюць.

Заўважыла, дачушка, ужо замоўк народ!? Не сьпявпае. Усе глядзяць тэлевізар. Развучыліся працаваць. Сьвяткаваць.

Зь кім ваявалі, за кім у бой ішлі, каго любілі, аказаліся ворагамі. Нават Янка Купала, такі вялікі наш сялянскі паэта, і той прадаўся, кажуць. Ці праўда гэта? Ці ж яму душу перамянілі? Штось тут ня так!

Таму наказваю табе, доч мая, каб ты разабралася ў гэтым камунізьме, што тут да чаго. Я ўжо старэю. І яшчэ, абавязкова зьезьдзі некалі за мяжу, як прыдасца мажлівасьць, у нейкую капіталістычную дзяржаву. Ці праўда, што там людзі гаруюць, а мы жывем лепей за ўсіх?”

15 студзеня 1985 года бацька памёр. На хаўтуры прыйшлі жонкі ягоных былых аднасяльчан з *Акшынкі*, бо мужы іхныя былі ўжо нябожчыкамі. Сталыя твары, сівыя косы, сьцягнутыя ў вузел на патыліцы, або выкладзеныя каронай на галаве. Бровы, як крылы птушак, над добрымі і разумнымі вачыма. Ніякай там касмэтыкі! Такі прыгожы народ! Міжволі думаеш: „Якімі ж яны былі ў маладосьці?”

А як загаласілі: *„У чыстым полю ды шырокая далі-гі-на-а-а,*

*А ў той шырыні дый вісокая ма-гі-і-і-ла-а-а-а.”*

Нібы сама зямля скаланулася. Я заплакала. Маці строга сказала: „Ня плач. Ён сваё аджыў. Няхай адпачне. Не трывож плачам ягоную душу.”

Сьлёзы самы застылі ў вачох.

Здавалася, што пахавалі ня проста майго бацьку, а апошняга беларуса... І думалася, што толькі ў мяне яшчэ баліць сэрца па нашай мове, па нашых песьнях і нашым народзе...

Дагэтуль мне здаецца, што ён жывы, проста выйшаў з хаты, каб пасядзець на лавачцы, што між кустамі бэзу, ля вішань. Выпаліць цыгарэту, паслухае свой прыёмнік пра тое, што дзеецца на сьвеце, і вернецца.

Але няма ўжо хаты і той лавачкі, й нават тых кустоў бэзу зь вішнямі. Засталася толькі дарога дахаты.

### *3. Вяртаньне да сябе, „хоць зернейкі засохшымі былі...” Выконваю І-ы запавет бацькі.*

1986 год. Прайшло 30 гадоў з таго часу, як бацька выпраўляў мяне ў школу. Падрастаў сын. Ужо чатырнаццаць. Трэ’ было назіраць, куды ён накіроўваў свой палёт. Зь вядучага архітэктара я перавялася ў простага школьнага настаўніка. Сын задаў пытаньне: „Калі мы беларусы, чаму ж не размаўляем па-беларуску?” Разам пераходзім на працягу месяца на родную мову. Удвох трапляем у „Талаку”*, якая жывой вадой пралілася на маю здранцьвелую душу.

У школе пытаюся ў вучняў старэйшых клясаў, ці ведаюць, хто яны па нацыянальнасьці. Большасьць пацiскала плячыма, хтось адказаў: „Наверно, рускіе”, сёй-той назваўся беларусам. Пры наступнай сустрэчы высьветлілася, што 80 адсоткаў зь іх былі беларусамі. Пачала расказваць ім гісторыю Беларусі і вучні самы прапанавалі, каб я выкладала па-беларуску.

Пасьля жалобнага дня *„Дзяды-88”*** сход сярэдняй школы №167 74-ма галасамі (пры адным устрымаўшымся) прымае пастанову: „Забараніць выкладаньне на роднай беларускай мове”. Дырэктар з ваенруком*** школы разганяюць дзіцячы беларускі фальклёрны гурт. Але я ўпартая, іду, як ішла...

*„Дзяды-88”* шмат каго абудзілі, зрабілі змагарамі за Беларусь. Колькасьць іх стала павялічвацца, як ком сьнегу, што коціцца з гары, набіраючы хуткасьць. Утварыліся Рух і Партыя БНФ.

Мы з сынам не засталіся ў баку ад палітыкі і ўдзельнічаем у мерапрыемствах Фронту. Настане час, і зерне прарасьце.

### *4. „Ці праўда, што мы жывём лепш за ўсіх?”*

1990 год. Ляцім у ЗША па запрашэньні на 19-ю сустрэчу беларусаў Паўночнай Амэрыкі я і мой 18-гадовы сын, хоць улезьлі ў даўгі, але ляцім. Цікава.

Прыпынак у Шэнане зьдзівіў разнастайнасьцю тавараў.У саветах мы не прывыклі да такога. У аэрапорце Кэнэдзі разздаваў транспарант: „Бежэнцы СССР — сюда!” Зь Бел-Чырвона-Белым Сьцягам нас сустрэлі Ганна і Антон Бартулі. У сваёй хаце нас прытулілі гасьцінна іхныя бацькі — спадарыня Вера і спадар Пранціш. Здалося, што трапілі ў казачны палац. Усё зіхацела чысьцінёй і добрым густам гаспадыні. На падворку стаялі дзьве машыны. Усё ў кветках. Каб усё гэта мець, спадар Бартуль у свае семдзесят з хвосьцікам гадоў працаваў з ранку да цёмна. Ніхто яму нічога „ня даў”. Усё зарабіў сваімі рукамі ды галавой.

Зьезд адбыўся ў мясьціне Полацак, што каля Кліўленда (штат Агаё). Два месяцы беларусы Амэрыкі апекаваліся тымі, хто ўпершыню прыбыў зь Беларусі і Беласточчыны. Усіх аблашчылі, адарылі. Паказалі Нью-Ёрк, звазілі ў Чыкага, Вашынгтон, на Ніагарскі вадаспад. Прыёмы, банкеты, найлепшыя музэі. Патрапілі нават у Мэтраполытэн на цудоўную опэру „Фантом” А.Вэбэра. А вечарамі, амаль да сьвітаньня, мы з Бартуліхаю заседжваліся за вышыванкамі і размовамі. Аказалася, што мы зямлячкі.

---

*Беларуская культурна-асьветніцкая „нефармальная” арганізацыя адраджэнскай моладзі ў 80-х гадах. Перасьледвалася камуністамі. (рэд.)

** Першая масавая маніфэстацыя Беларускага Народнага Фронту ў Менску 30 кастрычніка 1988 г., на разгон якой камуністычны рэжым кінуў унутраныя войскі, тысячы міліцыянтаў, вадзяныя гарматы, ужывалі сьлёзацечны газ. (рэд.)

*** Кіраўнік „ваеннай справы” ў савецкай школе.

Магла закружыцца ў эйфарыі галава. Разгульваць па Нью-Ёрку два месяцы за чужыя даляры зусім ня тое, што зарабляць свае і потым так растрачваць іх.

Усе беларусы Амэрыкі, якіх камуністы і савецкая ўлада прымусілі зьехаць сюды, вельмі шмат і цяжка працуюць. Але іх праца аплочваецца.

Гасьцявалася тут надта добра. Прыемна было бесклапотна назіраць з вакна машыны сп. Бартуля краявіды Нью-Ёрка. Але раней мы не пакідалі сваю Беларусь! І цяпер два месяцы бесклапотнасьці і бляску пачалі здавацца высылкай. Вяснавымі зарніцамі ўспыхвалі ва ўяўленьні ўспаміны з родных ніў ды палёў, з родных гаёў, пра хаты й мілыя сэрцу пагоркі, на якіх мы з сябрамі ладзілі свае традыцыйныя *„Гуканьні"* й *„Купальлі"*. На роздум ішлі вершы Сяргея Новіка-Пяюна (які паўжыцьця адседзеў у савецкім лягеры за волю Беларусі!):

*„Сады, палацы, камяніцы,*
*Выбрукаваныя вуліцы,*
*Гароды красак у чужыне*
*Зусім, зусім не для мяне!*
*Хоць гэта надта ўсё прыгожа,*
*Ды замяніць свайго ня можа."*

Можа, нехта не паверыць, але дадому мяне клікалі песьні бацькоў! Сьвяціла зоркай пуцяводнай спадзяваньне на незалежнасьць Беларусі.

## 5. Вяртаньне на Беларусь

Шмат пераменаў ня ў лепшы бок. У крамах пуста. Нічога ня купіш. Увялі талёны на харчаваньне, сродкі гігіены, абутак і адзеньне. На месяц — 200 грамаў масла, брусок гаспадарчага і кавалак туалетнага мыла, пачак мыйнага парашку. Жанчынам дазвалялася на год набыць дзьве пары кальготаў і бялізны (на лета і на зіму).

Затое ў тэатры імя Янкі Купалы йшоў спэктакль *„Тутэйшыя"*, на Вольнай Сцэне *Валеры Мазынскі* паставіў *„Паваліўся Нехта",* у тэатры *Міколы Трухана* (ужо нябожчыка) *„Дзея"* адбылася прэм'ера спэктакля *„Імжа" па Ф. Аляхновічу*, у опэрным дэбютаваў балет *„Утварэньне сьвету" Андрэя Пятрова*. На спэктаклі было цяжка трапіць. А людзі ледзьве зводзілі канцы з канцамі. „Нос выцягвалі — вязнуў хвост." Але хадзілі на вечарыны ў Дом літаратара і ў тэатры.

7-га лістапада 1991 года маладыя сяляне Алесь Касач і Пётра Касьнерык хацелі спаліць сябе ў знак пратэсту супраць ўлады камуністаў і іхняй палітыкі, якая пазбавіла іх зямлі. Сябры *БНФ*, дэпутаты (і я зь імі) стараліся не дапусьціць да роспачнага ўчынку сялян. Падчас правядзеньня *антыкамуністычнага мітынгу БНФ* на плошчы Леніна (пазьней — *плошчы Незалежнасьці*) людзі спальвалі свае камсамольскія і камуністычныя білеты. У гэтым я ўбачыла адказ на пытаньне і другі наказ майго бацькі.

## 6. Родны кут

У бацькоўскай хаце была камора. У ёй быў нейкі подых мінулых гадоў, нейкая таямніца. Яна прыцягвала да сябе. Стаяў стол з запасамі харчоў, побач — матчын вялікі зялёны куфэрак зь бялізнаю. Там ляжала адна кашуля матчынай маці, бабы Ганны з *Крыўска*, далікатна вышытая ніткамі па беламу ільну. На цьвіку — бацькоўскі шынэль, інструмэнты таты. Над старым ложкам, на якім летам у прахалодзе любілі ўсе паспаць, быў прымацаваны дыванок. Па сукну ў барвова-чорныя краткі маці крыжыкам вышыла аленяў. Калі мне было 13 гадоў, я разбурыла вышыўку ды пашыла сабе даўгую спадніцу ў складку, зьнізу выцягнула сем нітак, атрымаліся шчотачкі.Насіла зь белай блюзкай і чырвонымі караламі. Маці сьмяялася: „Гэта ж калісь такія андаракі ўсе насілі". Потым я змайстравала маці і сабе безрукаўкі з чорнага сукна, атарочыла краі чырвоным. Відаць, недзе ў падсьвядомасьці ўжо было ў ва мне пачуцьцё традыцыяў нашых строяў.

А самы дарагі падарунак маці прывезла мне з *Крыўску* — старую „шнуроўку" — гарсэтку бабы Ганны і пасак дзеда Мірона, які загінуў ад саветаў, маючы 41 год.

Маці навучыла вышываць гладдзю і крыжом. У 1982 годзе я захацела зрабіць мужчынскую вышыванку. Ня мела ўзораў. Пачала зьбіраць іх са старых строяў. Вывучала строі, песьні, абрады. Вучні, студэнты, моладзь цягнуліся да мяне. У іх, як і ў мяне, разам зь песьнямі, узорамі арнамэнтаў, традыцыйнымі абрадамі ўваходзіў дух Айчыны. Выраcталі адраджэнцы.

## 7. Суайчыньнікі

Пасьля вяртаньня з Амэрыкі неяк асабліва востра захацелася зьезьдзіць на радзіму бацькі ў *Акшынку*, дзе ніколі не была.

9 кастрычніка 1991 году я з маёй сяброўкай па *„Талацэ"* мастачкай і сьпявачкай *Аленай Ткачовай* прыехалі ў *Ветку.*Там даведаліся, што, пасьля Чарнобыля, *вёска Акшынка* не існуе... Апошнім аўтобусам адправіліся ў вёску *Неглюбка*, якую тутэйшыя называюць *Негляўкай.*

Вечарэла. Накрапваў восеньскі дожджык. На пытаньне ("Дзе тут жывуць майстрыхі?") нам адказалі: „А вось за тым нежывушчым домам." Вырашылі, што калі нас ня пусьцяць пераначаваць, то спынімся у гэтым „нежывушчым доме". Гаспадары Валя і Антось Халюковы, як мы завіталі да іх, тут жа накрылі стол. Мы адмаўляліся, але дарэмна. Для парадку зьявілася пляшка пшанічнай, гарачая бульба, сьвежаніна, квашаная капуста. Хата прыбраная. Усё толькі неабходнае. На куце, як і належыць, — абраз, увешаны тканымі ручнікамі. Рамы з фотакарткамі — ў ручніках. Навалкі падушак, падзорнік, што выглядаў з-пад посьцілкі, абрусы — ўсё ў тканых і вышываных магутных старадаўніх арнамэнтах.

Валя ўдзень працавала кранаўшчыцай на будоўлі. Дома — гактар зямлі, вялікая гаспадарка, муж, дзеці, унукі — ўсё клопат. А начамі ткала непаўторныя ў сусьвеце ручнікі.Каб плацілі па працы — жыла б яна ў палацы! „Зь пяску" гарышча яна дастала сваё мастацтва: ручнікі, абрусы, кашулі, хусткі, „пляцёнкі" зь бісеру на шыю, завушніцы зь пер'я курынага (бо жанчына сымвалізуе птушку). Я кінулася замалёўваць, распытваць. Валя кажа: „Ета хрест, які пайшоў, во вераб'і, кучараўкі, а ў нізе — мядзьведзі берягуць, кулачча, чорнае лісьце, вялікая зорка і кручча". Прыстаю: „А што азначае малы крыжык у ромбе?" Ткачыха абураецца маім няведаньнем і адказвае: „Прядзел! Усяму ёсьць — прядзел!"

Трэба разумець, што яна гаворыць аб пачатку ўсяго.

Ўраніцы першы аўтобус імчаў нас у *Ветку*, дзе нейкі час працаваў у сельсавеце мой тата.

Такі ўжо наш беларускі народ, што незнаёмым людзям, але сваім, якія ўвайшлі ў іхны дом, адкрылі душу. Нас напаілі, накармілі, паклалі спаць у лепшы ложак, ды яшчэ з сабой далі добры кавалак сьвежаніны, акрабец хлеба і не забыліся ў слоік наліць сьвежага малака. Разьвіталіся, як з роднымі. Запрасілі на абрад *„Пахаваньне стралы"*. Гэта апошняе сьвята паміж вясной і летам. Далей — *Русальчына нядзеля* і *Купальле.* Больш тысячы гадоў існуюць яшчэ гэтыя абрады на нашай зямлі, з часоў паганства.

*У Ветцы* мастацтвазнаўца гэтага краю *Галіна Нечаева,* якая родам з старавераў, зрабіла нам незабыўную экскурсію па славутым веткаўскім музеі. Яна падкрэсьліла, што, на яе думку, гэта менавіта стараабрадцы прыўнесьлі ў строі ды рушнікі *Неглюбкі,* разам з украінцамі, своеасаблівую непаўторнасьць. Выказала, што раней неглюбскія гарсэты быццам бы былі чырвонымі, ды неяк адна швачка памылкова, маўляў, пашыла чорны, і з тае пары ўсе пачалі шыць чорныя. Толькі вось доказу таму няма. Мы з Аленай моўчкі ўсьміхнуліся. Ня трэба „мудрствоваць лукаво", трэба шанаваць народ і яго творчасьць, у якой створаныя гэтыя „зоры", „хрясты", „кулачча" ды „кручча". І не прыплятаць сюды таго, чаго не было.

Пазьней Галіна Нечаева, кажуць, пачала пісаць вершы па-беларуску.

## 8. Кліч продкаў

14 чэрвеня 1992 года. Ушэсьце. Упершыню трапіла на абрад *„Пахаваньне стралы"* ў вёскі *Стаўбун* і *Неглюбку Веткаўскага раёну.*



***„Пахаваньне стралы”. 1998 г. Вёска Янава, Веткаўскі раён Гомельскай вобласьці.***

З тае пары штогод на Ўшэсьце быццам нехта голасна кліча мяне ў тую мясцовасьць. І я йшла, як на сьвятое прычасьце.

*Стаўбун* — вялікая вёска. У хаце Марыі Марозавай сьвяточны абед. За сталом шмат гасьцей: Галіна Нечаева зь веткаўскага музэю, я, Уладзь Панада (фатограф зь ЛІМу), восем заезных гасьцей з Масквы і Ленінграду, якія маюць спэцыяльныя мэты. Аказваецца, што ўжо некалькі гадоў запар яны прыязджаюць на *„Стралу”*, здымаюць на відэастужку, запісваюць галасы нашых баб. Трэ’ сказаць ім, можа, і дзякуй, што дапамаглі выпусьціць кружэлку зь песьнямі стаўбуноўскімі. Пакідаюць уражаньне добрых прыстойных людзей. І нашыя жанчыны дабрадушна сустракаюць іх, як сваіх. Разгаварылася з адной зь іх, Аняй. Аказваецца, яны кажуць, што па сваё прыйшлі, на свой „северо-западный” край?! Маўляў, і старaверы ў *Ветцы* жывуць, а гэта ж рускія. І сьлёзы шчырыя ў вачох ад замілаваньня. Кажу: „Аня, а ці можаш ты засьпяваць мне „исконна рускую” песьню? І тая зацягнула: *„Кругом, кругом сонца ходзя,*

*А дзе ж яно станавіцца...”*

Мне бы нажом у сэрца саданулі. Сноўдаюць па маёй зямлі — такія вось „добранькія”, скрадваюць наш фальклёр (розныя „ленінградцы”), скупаюць па 10 рублёў (за бясцэнак) у нашых бабак сьвіткі новыя белыя з кутасамі, робяць дакумэнтальныя фільмы і вядуць потым нашу *Стралу* на маскоўскіх сцэнах. З аднаго боку нашы бабы сьпяваюць, а з другога ўжо маскалькі йдуць, па-нашаму пяюць ды за сваё ўдаюць. Што гэта робіцца, думаю, каб па мае песьні, на зямлю майго бацькі, на маю зямлю маскалі прыйшлі!! Так, відаць, заўжды бывае пад акупацыяй, калі адна нацыя занепадае, то прыгнятаючая, ці суседняя яе культуру ў свой архіў скрадвае. А нашу яшчэ жывую культуру — разбурае.

Пытаюся ў стаўбуноўскіх жанчын: „А чаму гэта сьпяваеце вы, як багіні, а строяў нацыянальных у вас няма? За сем кілёмэтраў ад вас *Неглюбка* і ў іх ёсьць строі. Ці вы горшыя за іх? І ў вёсцы *Янава* ўжо не сустрэнеш бабу ў строі?”

“А дзетачка, — адказвае Марыя Марозава, — пасьля вайны папрысылалі нам з Масквы старшынь калгасаў. Бывала, народ ідзе, як мак цьвіце. А маскалі нас на работу не прымалі, калі хто ў строі быў, казалі, каб гэтыя караблі**** і дзяругі паздымалі. Мужыкоў было мала, бо вайна забрала, а дзетак трэ’ было карміць. Давялося нам у іхныя ацэтаты ды крамплены радзіцца. А андаркі пад ногі клалі ды падлогу імі мылі. Так і прапала ўсё! Толькі ж цяпер ужо маскалі нам ня ўказка!”

Сказала, выйшла на вуліцу, высока ўзьняла галаву, разумныя вочы засьвяціліся, бы ў дзеўкі, зычна зацягнула: *„Як пушчу стралу, ды па ўся-го-м сялу...”*

Да яе далучыліся суседкі. Сьпяваючы сумную песьню, павялі нясьпешны карагод. Павыходзілі гаспадыні зь іншых хат, далучыліся. У гэты ж час такія ж карагоды зачынаюць вадзіць на другім канцы вёскі, нібы арнамэнты ткуць на канцах ручнікоў. Потым бяруцца па 11-13 чалавек пад рукі, шыхт за шыхтамі вядуць зь песьнямі жалобнымі дзьве калёны, адну насустрач другой. Пасярэдзіне вёскі яны сустракаюцца і ўтвараюць два вялікія (унутраны і вонкавы) карагоды. Жалоба іхных галасоў здаецца ільецца ў касьмічную прастору.

Затым ужо адзінаю калёнаю *„вядуць стралу”* па дарозе да азімага поля (жыта-пшаніца). Сьвеціць сонца. З саду выпраменьваецца водар маладой лістоты і траў.

За вёскай, ля поля, насустрач *„страле”* жанчына выносіць зь пякарні гарачы каравай чорнага хлеба. Вакол яго ўтвараюць карагод. Рухаюцца па сонцу. Ушаноўваюць хлеб. Цалуюць. Упрыгожваюць краскамі.

Жанчыны заходзяць у вясновае жыта, кожная хавае ў рунь ў зямлю манэты, або маністы, прыгаворвае: „Цягні, Божа, каласы за валасы на небясы!”

Як *„пахавалі стралу”*, выходзяць з поля. Да іх далучаюцца мужчыны з трыма гармонікамі. Зь вясёлымі ўжо песьнямі ды скокамі вяртаюцца да вёскі. І заўсёды ў гэты час (быццам яго наклікалі песьнямі) пачынаецца дождж.

Пакуль сам не пабачыш, не пачуеш — не зразумееш і не паверыш.

Адбудавалі *ў Стаўбуне* царкву. Прыслалі папа маскоўскага. Яго паважаюць, маўляў, сьвяты. І ён ў *„Стралу”*, што існуе мо’ не адну тысячу гадоў, ужо карэкцыю ўвёў, каб каравай хлеба з поля да яго ў царкву несьлі...

---

**** „карабель” — жаночы ўбор галавы (рэд.)



*„Людзі з чыстымі душамі”, – (Валянціна Якімовіч)*

І што цікава. Стала я ля жанчын стаўбуноўскіх, засьпявала, як прыслухалася. Яны й кажуць: „Адразу відаць, што ты наша. А маскоўскія дзеўкі столькі год стараюцца, а штось не па-нашаму выходзіць”. Тут да мяне з выглядам генэралу з камэраю ў руках падыйшоў заезны Міша-расеец і стаў казаць, каб я адышла ў бок, бо, маўляў, я „ня ўпісваюся” сярод круглатварых ленінградак ды маскаляк, якіх ён пачаў здымаць разам з нашымі бабамі „для гісторыі”. І дрэннага пра іх, як быццам, ня скажаш. Фіксуюць тое (праўда, для сябе), што можа зьнікнуць назаўсёды. „Сьвятое месца пустым не бывае.” Ня йдуць свае — прыдуць чужынцы.

Жанчыны, што казалі „ты наша”, прынесьлі мне па дзясятку яек: „Вам у горадзе на тым асхвальце няма чаго есьці”. А адна падарыла тканы абрус і сваю кашулю з словамі: „Бачу, што табе гэта спатрэбіцца. Ня ім, а табе аддаю”.

Бярэ за сэрца. Якая прыгожая наша зямля і людзі! Райскі сад! Аблічча, імёны... Пе-рас-ке-ва.., Ма-ры-ля.., дыханьне стагоддзяў... Багатырова... Пціч. Людзі з чыстымі душамі. Шаную ўсіх.

*„Пахаваньне стралы”* існуе шмат дзе на этнічнай Беларусі (на Смаленшчыне і Чарнігаўшчыне, Севершчыне), але неяк ня трапіла ў поле зроку дасьледчыкаў. У кожнай мясцовасьці свая варыянтнасьць традыцыйнага абраду. Адны закопваюць у зямлю манэты і маністы, другія на месцах былых капліц выконваюць абрад пахаваньня зробленай імі лялькі, *у Неглюбцы* і *Янаве* ражаныя мужчына і жанчына качаюцца па полі, нібы стварваючы сымвал апладненьня, ці набіраючыся плоднай сілы ў зямлі.

У вёсцы *Верхнічы (Брагіншчына) на Ўшэсьце* таксама хаваюць *стралу.* (Тут легенда жыве, што людзі, якія засталіся пасьля Патопу, жылі на верхавінах дрэваў, якія паказаліся з-пад вады. Таму — *Верхнічы*.)

Але, ня гледзячы на некаторую зьменлівасьць у дэталях абраду, існуе адзіны стрыжань — ахвярапрынашэньне Богу (у старажытнасьці, відаць, — Пяруну), каб пладзіла і радзіла зямля, доўжыўся на зямлі наш РОД БЕЛАРУСКІ!

## *9. Хто ўратуе і хто абароніць?*

1993 год. Пачатак лета. Еду ў *Крыўск*, дзе не была пятнаццаць гадоў. Даўно памерла баба Ганна. Меншая сястра маёй маці гаспадарыць у старой хаце. Ёй пад восьмы дзясятак. Еду, гляджу ў вакно аўтобуса і не пазнаю зямлі дзяцінства. Уся зьнявечаная хімічнымі заводамі. Навошта нам іх столькі? Высокія брыдкія горы нейкіх пустых парод ружовага і жоўтага колеру выглядаюць як балячкі на целе. Здаравенныя жахлівыя трубы расьцягнуліся на шмат кілёмэтраў на паверхні зямлі. Зуродвалі краявіды, прыгажэйшых за якіх не было нідзе.

У хуткім часе мне падказваюць: „Выходзь, ужо Крыўск”. Страшна выйсьці. Не пазнаю роднай вёскі. На месцы, дзе было возера, ля якога мы пасьвілі з сястрой гусей і кароў, — перакрыжаваньне асфальтавых дарог.

Іду па любай сэрцу вёсачцы. Бывала раней ідзеш вось гэтак, а на завалінках ля хат сядзяць бабулькі ў бялюткіх хустачках і чысьцюткіх хвартушках. Вітаюцца. І кожная табе слова добрае скажа. А дамы на Гомельшчыне ніколі на замкі не зачыняліся. Калі ў клямку ўстаўлена галінка — гаспадароў няма ў хаце. Ніхто і не заходзіў. Платоў між надзеламі зямлі не было. Проста пакідалі вузенькую палоску неапрацаванай зямлі. На ёй красаваліся часам кусты парэчак, агрэсту. У хатах чысьціня. Парадак на падворку. На поле і з поля йшлі зь песьнямі. Уздымаліся рана, клаліся позна. Працавалі талакой. Як аралі зямлю, ля кожнай хаты арэлі на вярбе былі. Моладзь гойдалася і сьпявала. У дажынкі па ўсёй ваколіцы — перастук цапоў, як абмалочвалі зерне. А ўвечары — застольле і зноў песьні. Такі быў працавіты, добры і пявучы народ!

Калі хто спрабаваў звыш меры зазіраць у чарку, пра тое ведалі па ўсіх суседніх вёсках. Павагай такі не карыстаўся.

Іду зноў. Здраньцьвелы мой Крыўск. Няма мілых бабулек на завалінах. Ніхто не сьпявае. Не чуваць дзіцячых галаскоў. Як людзі без вачэй, стаяць уздоўж дарогі хаты з забітымі вакніцамі. Ціха. Сумна. Сьвішча вецер. Прашмыгнуў, бы юродзівы, нейкі падвыпіўшы мужычок.

Вось і знаёмыя вароты, хата бабы Ганны. На падворку нашым пяток курэй ды рыжы певень. Самотна рохкае сьвіньня, адна ў вялікім хляве. Пустая пуня. Хмель абвіў крыху пакошаны ўжо плот вакол двара. У хаце чыста. Але некалі дабяла вымытыя дубовыя масьніцы ўжо пафарбаваныя.

Сьціпла павячэралі з роднай цёткай. Забегла суседка. Цётка ад радасьці плакала, як некалі бабуля пры стрэчы.

У бярвенчатай хаце на драўляным ложку з ільнянымі даматканымі прасьцінамі дыхалася і спалася добра. За тры гадзіны выспалася, нібы праспала дзесяць. Сьвежае паветра раніцы. Абыйшла стары сад. Няма суседзяў, ні дзеда Міхеда, ні бабы Насты, ні Вульляны, ні іхных дзяцей, ні ўнукаў. Усіх разагнаў чарнобыльскі выбух.

З сумам і больлю разьвіталіся зь цёткай, з садам, мілымі ўспамінамі вясёлага дзяцінства і нечым неапраўдана страчаным, чаму няма цаны і тлумачэньня.

Хто гэты нечасьцівец, як ні сатана, што вытаптаў усё сьвятое? — Савецкі саюз! Хто ўратуе і хто абароніць?

Але ёсьць жа на Небе Бог.

Кожны раз, калі я йшла на мітынг ці дэманстрацыі, калі йшла да сваіх, да грамады людзей, каб узьняць там прылюдна наш сьцяг і гэрб Пагоню, думала: „Хто, калі не я? Я — ўздыму.”

*27 сакавіка 2001 г.,*
*Нью-Ёрк* **Валянціна ЯКІМОВІЧ**

# „ЦЫРКУЛЯР”

Узрушвае і радасна бачыць, калі нават у вельмі цяжкай сітуацыі, нават, здавалася б, бязвыхаднай, беларус змагаецца і хоча дапамагчы Бацькаўшчыне любымі спосабамі; пры нястачы магчымасьцяў, хоць кропляй, хоць калівам.

Спадар ***Аляксандар Міцкевіч*** жыве ў Нью-Ёрку, мае ўжо 82 гады. Ён рэгулярна складае інфармацыйны лісток (“Цыркуляр”) пра навіны беларускага Адраджэньня, якія зьбірае, то з інтэрнэту, то з часопісаў, то з газэтаў і рассылае лістамі па адрасах беларусаў у Амэрыцы, Канадзе, Вялікабрытаніі, Аўстраліі, у Летуву, Расею, на Бацькаўшчыну.

Нехта, хто дастаткова паінфармаваны, магчыма, і не зацікавіцца, а іншаму і добрая навіна. Карысная гэта справа і знаходзіць сваіх чытачоў.

У 27 нумары „Цыркуляру” за сакавік гэтага году прачытала ліст Ю.К. зь Віцебску. Аўтар ліста, „вызвольны франтавец”, піша: „Сістэма замежных СМІ (у тым ліку — па-беларуску) падае нашу інфармацыю ў рэчышчы „аб’яднанай дэмакратычнай апазыцыі” дыктатарскаму рэжыму. Але ж гэта няправільна, бо раўняць затрыманьне ***Шчукіна*** ў Менску і ***Плешчанкі*** ў Віцебску (або іх абодвух разам у Віцебску) нельга. Бо першы сьцьвярджае правы сваёй асобы, другі — правы сваёй нацыі на самавызначэньне...

Праблема яшчэ і ў тым, што абывацелі вельмі павольна далучаюцца да нацыянальнай ідэі, шукаючы ў ёй выгады... У нас пусьцілі чутку, што можна непрацуючым падзарабіць цераз БНФ у Амэрыцы. Дык прыйшлі натоўпам у БНФ 20-ці—25-гадовыя дзяцюкі. Удзельнічалі ў палітыцы, а як выйшла, што чутка гэтая ёсьць мана, пайшлі прэч.”

Цікавая інфармацыя. А колькі мы ўжо набачыліся такіх невядомых „змагароў” тут, у Амэрыцы.

***Ганна ПАШКОЎСКАЯ***

# АМЭРЫКА ДЛЯ АМЭРЫКАНЦАЎ

Не шукайма сьляды нашых продкаў, а шукайма тое, што шукалі яны. Так казалі некалі мудрыя людзі.

Нашы продкі шукалі шчасьця, велічы і свабоды. Гэта было найвялікшае шуканьне, бо яму ахвяраваліся, за яго змагаліся і рызыкавалі жыцьцём. Такое змаганьне мае асаблівы сэнс, калі пад пагрозай знаходзіцца лёс народа, ці калі незалежнасьць яго страчана. Тады рушэньне рана ці позна набывае грамадзкую шырыню і выяўляецца ў форме нацыянальна-вызвольнага руху. Нацыянальна-вызвольны рух меў усеагульны характар. Ён узьнікаў там, дзе існавалі імпэрыі. ***Вызвольны рух — гэта заўсёды канцэпцыя змаганьня з імпэрыяй за свабоду і незалежнасьць***.

У Эўропе працэс вызваленьня з-пад імпэрскіх путаў найбольш інтэнсіўна адбываўся ў другой палове XIX і пачатку XX стагоддзяў, калі мноства народаў Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы адваявалі сваю незалежнасьць.

Тады ў Эўропе змагаліся супраць чатырох імпэрыяў: Турэцкай Атаманскай імпэрыі, Аўстра-Венгерскай, Прусіі і Расеі. Але найперш, яшчэ ў XVIII стагоддзі пачала трашчэць Брытанская каляніяльная марская імпэрыя.

Першымі супраць брытанскага панаваньня паўсталі амэрыканцы. У той час наш вялікі беларус і герой гэнэрал Андрэй Тадэвуш Касьцюшка змагаўся за свабоду Амэрыкі. У цэнтры Вашынгтону яму стаіць бронзавы помнік на ўвесь рост.

Амэрыканцы першымі выявілі сутнасьць і формулу антыкаляніяльнага змаганьня за неэалежнасьць. Яна вызначаецца ў закліку і сцьвярджэньні: ***„АМЭРЫКА — ДЛЯ АМЭРЫКАНЦАЎ!”***.

У гэтых словах выяўлены ўнівэрсальны зьмест дэкалянізацыі і нацыянальна-вызвольнай барацьбы, дзе б яна ні адбывалася. Калі грамадзтва не наблізілася да зьместу і разуменьня гэтага сцьвярджэньня, значыць яно яшчэ цалкам не пасьпела да вызвольнага змаганьня.

І сапраўды, чаму краіна, зямля, на якой спрадвеку жыве і працуе пэўны народ, павінна належыць нейкай іншай краіне, чаму нейкія іншыя павінны ў ёй распараджацца і карыстацца зь яе багацьцяў ды з працы яе народу? Гэта ж парушэньне прыроднага і Боскага права. Гаспадар на зямлі той народ, які асвоіў і акультурыў яе сваёй працай, розумам і духам ад самага пачатку і спрадвеку, які стварыў на ёй культурнае грамадзтва цягам перадачы вынікаў працы ад продкаў з пакаленьня ў пакаленьне і прадаўжае на ёй жыць, тварыць і працаваць.

Эўрапейскія пасяленцы ступілі на амэрыканскі мацярык як піянэры і як калянізатары і адначасна самы апынуліся ў каляніяльнай залежнасьці ад мэтраполіяў. Яны сутыкаюцца з індзейцамі, што там жылі на пэўных тэрыторыях і адначасна займалі незаселеныя першародныя землі, якія абкультурылі і пераўтварылі сваёй працай, стварылі на іх цывілізаванае грамадзтва.

Барацьба за незалежнасьць ад мэтраполіяў вынікала з натуральнага права, а знакаміты і клясычны лёзунг вызвольных змагароў — „Амэрыка — для амэрыканцаў!” — адлюстроўваў гэтае права.

Потым, змагаючыся за незалежнасьць супраць імпэрыялізму, кожны народ выкарыстоўваў гэтае права ў сваім закліку і ў сваёй форме: „Мадзьяршчына (Венгрыя) — для мадзьяраў”, „Балгарыя — для балгараў”, „Італія — для італьянцаў”, „Беларусь — для беларусаў” і г.д.

Беларускія адраджэнцы пачатку XX-га стагоддзя выдатна разумелі гэтую ідэю. Лёзунг „Беларусь — для беларусаў” быў сінонімам сцьвярджэньня „Незалежная Беларусь”.

На грунце гэтай вялікай ідэі ў 1918 годзе была ўтворана Беларуская Народная Рэспубліка, прадэкляравана дэмакратыя і свабода.

У 1920-х гадах вялікі паэт і прарок беларускага адраджэньня Янка Купала па-мастацку выявіў і адлюстраваў вызвольны лёзунг незалежнасьці і свабоды ў выдатным творы — п’есе „Тутэйшыя”. У п’есе ў надзвычай яркай і вобразнай форме паказана, як чужынцы, імпэрыялісты ўсіх колераў, акупанты з усходу і з захаду топчуцца па безабароннай Беларусі, абдзіраюць і зьневажаюць беларускі народ, ды даказваюць яшчэ сваё прыдуманае „права” на акупацыю Беларусі. І тады станоўчы герой твора напрасткі грымотна зьвяртаецца да ўсіх з магутным і справядлівым заклікам беларускага Адраджэньня: „Беларусь — для беларусаў!”.

Янка Купала ў словах свайго станоўчага героя таксама выводзіць

генэзіс ***нацыянальна-вызвольнай ідэі*** з натуральнага права і кліча ісьці ўсьлед за Амэрыкай па шляху незалежнасьці і свабоды.

Калі мы хочам спыніць акупантаў і гандаль нашай зямлёй, калі мы хочам сапраўды адрадзіць сваю дзяржаву і незалежнасьць, калі мы сапраўды цэнім свой гонар і хочам быць вольнымі людзьмі і гаспадарамі, — мы мусім паставіць заслон усялякай акупацыі, каляніялізму і чужой імпэрскай палітыцы і напісаць на сваім сьцягу выразна і запаветна: „Беларусь — для беларусаў”.

Так казаў вуснамі сваіх драматычных герояў Янка Купала.

Для калянізатараў з усходу і з захаду, якія праводзілі інтэграцыю, асіміляцыю ды вынарадаваньне беларусаў, усьведамленьне беларусамі вызвольнай мэты — „Беларусь — для беларусаў” — было цьвіком у труну ўсёй захопніцкай палітыкі. На гэтым шансы акупантаў канчаліся. Няма нічога дзіўнага, што п’еса Янкі Купалы была забароненая.

У 20-х — 30-х гадах мінулага стагоддзя ворагі Беларусі з Усходу і з Захаду галоўны ўдар накіравалі на разгром Беларускага Нацыянальна-вызвольнага Руху. Сумеснымі намаганьнямі ім гэта ўдалося. Тысячы беларускіх адраджэнцаў былі расстраляныя ў Курапатах ды засьценках НКВД, забітыя падасланымі забойцамі, укінутыя ў ГУЛАГ ды Картуз-Бярозу, высланыя ў Сібір ды азіяцкія стэпы; беларускія палітычныя і грамадзкія арганізацыі пазачынялі і забаранілі, беларускі адраджэнскі друк ліквідавалі, беларускія кнігі спалілі ды арыштавалі ў спэцаддзелах бібліятэк. А потым, ужо ў пасьляваенны час, адбывалася мэтадычнае ганьбаваньне і абплёўваньне ўсяго адраджэнскага беларускага — вялікіх людзей, палітыкаў, пісьменьнікаў і паэтаў; фальсіфікавалі беларускую гісторыю, перакручвалі і замоўчвалі падзеі, зьнеслаўлялі вялікія і справядлівыя ідэі.

Тры зьявы Беларускага Адраджэньня выклікалі асаблівую нянавісьць у рускіх бальшавікоў — гэта дзейнасьць Рады БНР, беларускае адраджэньне ў час 2-й Сусьветнай вайны за немцамі і вызвольны лёзунг „Беларусь — для беларусаў”.

У зьнеслаўленьні гэтых каштоўнасьцяў бальшавіцкая прапаганда выкарыстоўвала толькі адзін псіхалягічны аспэкт: падсьведамасьць нянавісьці Другой Сусьветнай вайны.

Усё нацыянальнае беларускае, што завязана было з нацыянальнай ідэяй і беларускім адраджэньнем, аб’яўлялася фашысцкім: ці гэта беларускі нацыянальны *Бел-Чырвона-Белы Сьцяг*, ці гэрб *Пагоня,* ці імёны забароненых вялікіх паэтаў, нават проста размова па-беларуску ва ўнівэрсытэце ці ва ўстанове — усё кваліфікавалася стукачамі, савецкімі абывацелямі і прапагандыстамі як „фашызм”. Беларускае падавалі ў двух азначэньнях: альбо „мужыцкае”, альбо — „фашызм”.

Руская камуністычная прапаганда ў Беларусі паўтарала гэтыя, скажам проста — ідыёцкія ярлыкі, з дня ў дзень, тупа, ненавісна і пастаянна, пакуль існаваў СССР.

Палітычная формула нацыянальна-вызвольнага руху „Беларусь — для беларусаў” перакручвалася пад савецкія ідэалягічныя ўяўленьні. За часы камуністычнага СССР ідэалёгіяй рускага імпэрыялізму і русіфікацыі быў так званы „інтэрнацыяналізм”, згодна якога нібыта сьціраліся адрозьненьні паміж акупаванымі народамі ды расейцамі і ствараўся так званы „адзіны савецкі народ” (гэта значыць „адзіныя расейцы”). Палітычны лёзунг нацыянальнай свабоды камуністы апускалі на этнічны ўзровень і тлумачылі, што беларускія „нацыяналісты” (а, значыцца, — „фашысты”) хочуць выгнаць зь Беларусі ўсіх расейцаў, усіх габрэяў, усіх, хто не беларусы, і стварыць этнічна чыстую дзяржаву.

Тым часам ***палітычны зьмест лёзунга вызвольнага руху мае антыкаляніяльны сэнс і вырашае пытаньне, каму павінна належыць краіна і хто ў ёй гаспадар***, а ня тое, хто ў ёй павінен жыць (як спэцыяльна перакручвалі калянізатары).

Злавеснае адценьне набывае подласьць гэтай прапаганды, калі ўлічыць, што этнічныя чысткі і генацыд ажыцьцяўлялі якраз камуністы ў Савецкім Саюзе (прымусовае высяленьне татараў, чачэнцаў, інгушоў і інш.), у былой Югаславіі, у камуністычнай Польшчы (прымусовае высяленьне ўкраінцаў), у камуністычнай Балгарыі (дачыненьні да турак) і г.д. Я ўжо не кажу пра Кітай і азіяцкія рэжымы.

Тым часам нічога падобнага не рабілі дэмакраты і нацыянальна-вызвольныя рухі. У іх іншая, не таталітарная прырода.

Але трэба ведаць камунізм і Расею, каб зразумець характар іхняе прапаганды, пабудаванай на агрэсіўнай хлусьні.

Рэцыдывы гэтай прапагандысцкай агрэсіі мы сустракаем і цяпер. Нічога дзіўнага — існуюць пастаянныя крыніцы рэпрадукцыі старой нянавісьці да беларускага адраджэньня — гэта савецкая псіхалёгія часткі насельніцтва і — галоўнае — нязьменнасьць імпэрскай палітыкі Расеі ў дачыненьні да Беларусі.



***Помнік Тадэвушу Андрэю Касьцюшку ў Вашынгтоне***

Нягледзячы на маштабныя спробы расейскіх спэцслужбаў у канцы 90-х гадоў мінулага стагоддзя разграміць Беларускі нацыянальна-вызвольны рух, нічога ім не ўдалося. Вызвольны Рух мацнее і пашыраецца. Ён зьяўляецца рэальнай сілай, якая выяўляе нацыянальныя інтарэсы Беларускага Народу і супроцьстаіць расейскай імпэрскай палітыцы інтэграцыі і захопу нашай краіны.

На сьцягах і харугвах беларускага Адраджэньня несьмяротныя словы Янкі Купалы — „Жыве Беларусь!” і лёзунг амэрыканскага змаганьня за незалежнасьць, які зноў жа голасна падняў наш вялікі пясьняр — ***„БЕЛАРУСЬ — ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ!”***. Гэта ***наша*** зямля.

І пакуль зьмест гэтых словаў трымае высока і змагаецца за яго хоць частка людзей, ніякі антыбеларускі рэжым ня будзе існаваць доўга. Ніякі агрэсар ня будзе ўпэўнены, што стане жыць за наш кошт і намі, беларусамі, кіраваць. Мы абавязкова вернемся да нармальнага стану, умацуем дзяржаву і незалежнасьць, усталюем права, справядлівасьць і дэмакратыю.

Гэта ня марныя словы, бо гісторыя і вопыт іншых пацьвярджаюць правільнасьць вызвольнага шляху. Ствараць можа толькі свабодны народ. І толькі свабодны народ здольны шанаваць свабоду іншых народаў.

*22 лютага 2001 г.*

***Зянон ПАЗЬНЯК***

*Нью-Ёрк*

# ДУМКІ „АПАЗЫЦЫІ” ПРА ВЫБАРЫ ПРЭЗЫДЭНТА

### *„Допустить нельзя”*

*(Тацьцяна Працька, старшыня БГК)*

Как „лукашисты”, так и оппозиционеры, должны чётко уяснить: допустить нелегитимного, с точки зрения мирового сообщества, президента — нельзя.” *

***(Народная Воля, — 2001, 20 лютага)***

### *„Крайне вредно”*

*(Сяргей Калякін, кіраўнік Партыі камуністаў у Беларусі)*

“Ни в коем случае нельзя делать ставку на отторжение России. И вообще, крайне вредно сегодня — с любых точек зрения — говорить о российском империализме.” **

***(Белорусский Рынок, — 2001, №3)***

### *„Кто серьезно среагирует”*

*(Аляксандар Пласкавіцкі, галоўны юрыст Адміністрацыі Лукашэнкі)*

“Выиграют все, кто серьёзно среагирует на сигналы Синицына. Выиграют инвесторы... Выиграет Россия: ей не придется спасать от голодной смерти обворованных союзников... Выиграет ОБСЕ... Выиграют все политические силы Беларуси, вплоть до самых маленьких. Синицын проложил им дорогу на широкое поле политических маневров, где каждый политик становится полноценным участником процесса обсуждения и принятия правил политической игры на президентских выборах.” ***

***(Народная Воля, — 2001, 31 сакавіка)***

---

* „Дапусьціць нельга.” „Як „лукашысты”, так і апазыцыянеры, мусяць выразна ўсьвядоміць: дапусьціць нелегітымнага, з пункту гледжаньня сусьветнай супольнасьці, прэзыдэнта — нельга.” (з рус.)

** „Крайне шкодна.” Ні ў якім разе нельга рабіць стаўку на адштурхоўваньне Расеі. І ўвогуле, крайне шкодна сёньня — з любых пунктаў гледжаньня — гаварыць пра расейскі імпэрыялізм.” (з рус.)

*** „Хто сур’ёзна зрэагуе.” „Выйграюць усе, хто сур’ёзна зрэагуе на сігналы Сініцына. Выйграюць інвэстары... Выйграе Расея: ёй ня прыйдзецца ратаваць ад галоднай сьмерці абкрадзеных саюзьнікаў... Выйграе АБСЭ... Выйграюць усе палітычныя сілы Беларусі, аж да самых малых. Сініцын праклаў ім дарогу на шырокае поле палітычных манэўраў, дзе кожны палітык становіцца паўнавартасным удзельнікам працэсу абмеркаваньня і прыняцьця правілаў палітычнай гульні на прэзыдэнцкіх выбарах.” (з рус.)

# ПРЭС-РЭЛІЗ

*(паводле „Народнай Волі”, „Нашай Свабоды”, SANA, „БДГ”; лістапад, сьнежань 2000 г.)*

■ *26 лістапада Кансэрватыўна-Хрысьціянская Партыя — БНФ* і *Беларускі Народны Фронт „Адраджэньне”* правялі мэмарыяльныя мерапрыемствы, прысьвечаныя ***80-м угодкам Слуцкага Збройнага Чыну***. У Слуцку адбыўся мітынг з удзелам больш за 200 асобаў, якія трымалі *Бел-Чырвона-Белыя* і *грунвальдзкія сьцягі, харугвы* і *плякаты ў гонар герояў-случакоў*. На мітынгу быў зачытаны зварот *Зянона Пазьняка,* выступілі намесьнікі старшыні Партыі БНФ сп.сп. *Ю. Беленькі* і *Мікола Анцыповіч*, прадстаўнікі АГП. Пасьля мітынгу грамада прайшла праз цэнтар гораду і ўшанавала памяць герояў ускладаньнем вянкоў і патрыятычнымі сьпевамі каля будынку, дзе ў 1920 г. праходзіў ***1-ы Зьезд Случчыны***. На аўтобусах грамада праехала па месцах баёў случакоў з бальшавіцка-маскоўскімі ордамі і месцах пакутніцтва герояў. У Вызьне, Семежаве і Грозаве людзі ўсклалі вянкі і кветкі, паставілі сьвечкі да крыжоў у памяць герояў, прасьпявалі рэлігійныя і ваярскія гімны. Мясцовыя жыхары далучыліся да мэмарыяльных мерапрыемстваў.

■ *27 лістапада ў Беларусі* адбыліся характэрныя кадравыя перастаноўкі. Прадстаўляючы на калегіі новага старшыню КГБ — **расейскага разьведчыка Леаніда Ерына**, Лукашэнка заявіў, што былы старшыня КГБ Уладзімер Мацкевіч і былы генпракурор Алег Бажэлка рыхтавалі змову супраць вышэйшых кіраўнікоў дзяржавы. У першай інфармацыі аб адстаўках называліся тры прозьвішчы: дзяржсакратара рады бясьпекі Віктара Шэймана, генпракурора Бажэлкі і галоўнага гэбіста Мацкевіча. Потым дадалі яшчэ двух беларусаў: нам. старшыні КГБ Генадзя Наркевіча і міністра культуры Аляксандра Сасноўскага.

Шэймана ня толькі адправілі ў адстаўку, але і звольнілі з вайсковай службы. Але „пахаваньне” **Шэймана** працягвалася нядоўга. Быў наступны ўказ аб прызначэньні яго генпракурорам. **Урал Латыпаў** стаў дзяржсакратаром Рады бясьпекі. А на ягонае месца прыбыў вернуты з канадзкай амбасады памочнік „прэзыдэнта” па міжнародных пытаньнях **Міхаіл Хвастоў**. З Бажэлкам абышліся неяк гуманна. Ён звольнены „у сувязі з пераходам на іншую працу”. Сасноўскага звольнілі за „сур’ёзныя ўпушчэньні ў арганізацыі працы міністэрства”.

**Працягваецца этнічная чыстка ва ўладзе акупантаў**. Выганяюцца беларусы, і на іх месца ставяцца **расейцы**, **функцыянэры ФСБ-КГБ**. **Нядоўгі век калябарантаў**.

■ *Лукашэнка трымаецца на расейскай разьведцы.* Служба зьнешняй разьведкі Расеі (СВР), насуперак законам РФ, працуе ня толькі на Пуціна, але і на Лукашэнку. СВР рэгулярна перадае яму аналітычныя ды апэратыўныя матэр’ялы. Сэнсацыйнае прызнаньне зрабіў сам Лукашэнка, чым шакіраваў старшыню СВР Расеі генерал-лейтэнанта Сяргея Лебедзева. 9 лістапада ў Менск прыляцеў начальнік расейскіх шпіёнаў, каб паразмаўляць з беларускімі калегамі, структурна падпарадкаванымі мясцоваму КГБ. Але Лукашэнка ня мог упусьціць магчымасьць і запрасіў генэрала на сустрэчу. Як заўсёды, на пратакольныя 5 хвілін „панове” дапусьцілі журналістаў. І Лукашэнкау панесла. Раптам ён, зьвяртаючыся да прэсы (і шматмільённых гледачоў БТ) пачаў дзячыць Лебедзева за аналітычныя матэр’ялы, якія атрымлівае ад яго службы. Гэтыя дакуманты, па яго словах, аказваюць яму „неацанімую” дапамогу і даюць магчымасьць „спакойна перажыць” самыя сур’ёзныя падзеі. Генэрал Лебедзеў пакутліва ўсьміхнуўся — маўляў, ня варта падзякі. Але вядома, што паводле закону „Аб зьнешняй разьведцы” і палажэньні аб СВР (яно не сакрэтнае) забаронена даваць якія-небудзь матэр’ялы ня тое, што кіраўнікам іншых дзяржаваў, але нават ворганам выканаўчай улады РФ.

■ *З 8-мі трыльёнаў рублёў*, укладзеных сёлета рэжымам ў сельскую гаспадарку Гомельскай вобласьці, вярнулася каля *75%.* Кошт выраблёнай прадукцыі аказаўся меншы за атрыманыя бюджэтныя сродкі ў штодзясятай гаспадарцы вобласьці. Яны стратныя.

■ *Звальненьне пагражае большасьці* з 350 работнікаў Глыбоцкага кансэрвовага заводу. Тут яшчэ не прададзена палова выраблёнай прадукцыі і фактычна правалены сэзон нарыхтовак. Мелася надзея на „неабсяжны расейскі рынак”. Паехалі на кірмаш у Ніжні Ноўгарад, але вярнуліся ні з чым. Там свае заводы. У такой жа сітуацыі яшчэ 6 кансэрвавых заводаў Беларусі.

■ *Група беларускіх навукоўцаў* зьвярнулася да 55-й Генэральнай Асамблеі ААН і да генсакратара ААН Кофі Анана. Нагодай паслужыла справаздача навуковага камітэту ААН па ўзьдзеяньні атамнай радыяцыі за 2000 г. У ім ёсьць аналіз наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. З высновамі камітэту беларускія навукоўцы не пагадзіліся. Аказваецца, у падрыхтоўцы справаздачы беларускія навукоўцы ўдзелу не прымалі (!). Іх дасьледваньні ніхто не браў у разьлік. **Старшыня камітэту ААН Ларс-Эрык Хольм** сцьвярджае, што „галоўнай прычынай павелічэньня анкалягічных захворваньняў у Беларусі сталі сацыяльна-эканамічныя наступствы развалу СССР, якія якраз адбываўся падчас Чарнобыльскай аварыі”.

З гісторыяй ў скандынава зусім кепска. Па часе згаданыя падзеі не супадаюць. Пры такім падыходзе да праблемы з боку міжнароднага

атамнага чынавенства буйнейшая тэхнагенная катастрофа рызыкуе стацца „невялічкай тэхнічнай паломкай”. Тым больш, што Хольм параіў двум з паловай мільёнаў беларусаў, якія жывуць на атручаных тэрыторыях, не баяцца радыяцыі. Паводле ягоных словаў, яна небясьпечная толькі ў вялікіх дозах. (Чакаем зьвестак аб прыезьдзе сп.Хольма з сям’ёй у Брагінскі раён.)

■ Адмоўнае сальда ў Беларусі за 10 месяцаў 2000 г. склала 923 мільёны даляраў. З Расеяй наогул — 1488 мільёнаў даляраў. Гэта вынік росту коштаў на расейскія энерганосьбіты.

■ Па дадзеных міністэрства аховы здароўя, зараз у Беларусі 63% лекаў разыходзіцца па льготных рэцэптах альбо наогул задарма. Цяпер бедным людзям (пэнсіянерам і ветэранам) ільготы адмянілі. Ў „ільготніках” засталіся зусім не бяднейшыя слаі.

■ За апошнія 10 гадоў колькасьць хворых на пранцы і ганарэю павялічылася ў Беларусі ў **45** разоў. За 2000 год зафіксавана каля **9 тысячаў** выпадкаў. Па тэмпах росту хворых на пранцы мы займаем **1 месца** ў Эўропе.

■ Экспрапрыятараў стане болей. Перад Новым годам Лукашэнка выдаў дэкрэт „Аб унясеньні дапаўненьняў у дэкрэт ад 4 верасьня 1998 г. №15”. Цяпер ня толькі Камітэт дзяржкантролю і органы ўнутраных справаў, але і органы фінансавых рассьледваньняў маюць права экспрапрыяваць у юрыдычных асобаў і прадпрымальнікаў тавар, набыты альбо рэалізаваны без суправаджальных дакумантаў. (Але каб вырабіць суправаджальныя дакуманты, трэба пралезьці праз велізарны бюракратычны частакол.)

■ ***Яўген Тоўгень** „Немагчыма доўга падманваць народ”.* Калі чытаеш прамову Лукашэнкі ў так званым „савеце рэспублікі”, то ўзьнікае ўражаньне, што ягоныя памочнікі нешта пераблыталі... Чытаем: „... а таксама прыняцьцё іншых захадаў дазволілі, пачынаючы з 1996 г., пераадолець спад вытворчасьці, дасягнуць станоўчай дынамікі макраэканамічных працэсаў. Штогод забясьпечваецца прырост валавага ўнутранага прадукту, спажывецкіх тавараў...” Цяжка паверыць, што гэтыя радкі — пра Беларусь. Паводле дадзеных ААН, большасьць насельніцтва нашай краіны мае прыбыткі ніжэй за мінімальны спажывецкі бюджэт. Калі ў 1990 г. за сярэдні заробак можна было набыць 2,1 набора тавараў і паслуг, што ўваходзяць у мінімальны спажывецкі бюджэт, то ў 1998 г. — толькі 1,3, а на пачатку 1999 г. — 1,1.”

Далей аўтар падае параўнальныя лічбы, узятыя з дзяржаўнай беларускай статыстыкі. За 1994 і за 1999 гады выпушчана: *мэталарэжучых станкоў у 1994 г.* **5,7** *тысячаў (тыс.), а ў 1999 г. —* **4,5** *тыс; трактараў у 1994 г.* **42,9**, *а ў 1999 г.—* **27,4** *тыс.; мяса ў 1994 г.* **474** *тыс. тонаў (т.), а ў 1999 г.—* **269** *тыс. т.; малака ў 1995 г.* **3062** *тыс.т., а ў 1999 г.— **2800** тыс. т.; буйной рагатай жывёлы ў 1994 г. было* **5037** *тыс. галоў, а ў 2000 г.—* **3725** *тыс. галоў.*

„А як пражылі апошнія 5 гадоў Польшча, Чэхія, Эстонія? — працягвае аўтар. — У Польшчы ў 1995 г. сярэдні заробак склаў 285 даляраў, 1999 г. — 370. У Чэхіі павелічэньне заробку адбылося з 308 да 363 даляраў, у Эстоніі са 186 да 324 даляраў, у Летуве са 161 да 246 даляраў.

А ў Беларусі? Калі ў 1994-95 гг. сярэдні заробак набліжаўся да 100 даляраў, то цяпер — каля 70. Замест дзелавога аналізу, начальства „вешае лапшу”. Відаць, імкнуцца любымі сродкамі падмануць людзей яшчэ раз, цяпер перад прэзыдэнцкімі выбарамі.”

■ Так званы „кансультацыйны савет апазыцыйных палітычных партыяў” (гэта ўсё пра „аб’яднаную апазыцыю”) прапанаваў урадаваму боку аднавіць кансультацыі на ўзроўні экспэртаў у галіне СМІ пры пасрэдніцтве КНГ АБСЭ, куды нават перадалі адпаведныя дакументы. Дык вось, у адным з гэтых дакумантаў (“Мэмарандуме аб стане інфармацыйнага забесьпячэньня грамадзтва ў пэрыяд выбарчых кампаніяў”) адзначаецца, што выбары ў „палату” паказалі, „што цяперашняе кіраўніцтва краіны, насуперак законам і ўзятым на сябе міжнародным абавязацельствам, практычна поўнасьцю перакрыла доступ для палітычнай апазыцыі ў падведамасныя ўладам СМІ”. Ацэнка, здаецца, слушная. А якая ж з гэтага выснова? Выснова такая: трэба аднаўляць працу экспэртаў па СМІ, якія зноў будуць весьці бясконцыя, бязвыніковыя дыялёгі з рэжымам. У народзе на гэткае кажуць: „Ім хоць у вочы...”

■ БДГ апублікавала вельмі цікавае інтэрв’ю зь вядомым дзеячам КНГ АБСЭ сп. Г.-Г. Вікам. Вось найцікавейшыя фрагмэнты:

— Ці магчымая нармальная праца пасьля больш чым нэгатыўных выказваньняў Лукашэнкі, шэфа КГБ і БТ наконт дзейнасьці АБСЭ, — пытаецца журналіст?

— Міністар замежных справаў нічога такога не казаў, — адказвае сп. Вік. — Міністэрства ўсяроўна супрацоўнічае з КНГ — часам у добрае надвор’е, часам у кепскае.

— Але вы супрацоўнічаеце ня толькі з МЗС, але і з усімі дзяржаўнымі інстытуцыямі... Як вы будзеце працаваць з прэзыдэнцкай адміністрацыяй, — КГБ?

— Ня маю нічога дадаць (працягвае сп.Вік). Адна справа — прамовы на публіку, іншае — рэальнае супрацоўніцтва. Сур’ёзна можна казаць толькі пра прагматычны эфэкт.

— Як бы вы пракамэнтавалі словы Лукашэнкі пра ўвоз выбуховых рэчываў і шпіёнах? — наступнае пытаньне.

— Гэта ён казаў ня ў сувязі з АБСЭ.

Пікетоўшчыкі зь *Беларускага Вызвольнага Руху*, якія трымалі перад сядзібай АБСЭ плякаты „***Вік, вяртайся дахаты!”***, сапраўды мелі рацыю. Герою надзвычай шчырага інтэрв’ю важны толькі „прагматычны эфэкт”. Наступны раз пікетоўцам трэба прыйсьці туды з плякатамі „*Няхай жыве супрацоўніцтва КНГ АБСЭ з рэжымам Лукі!”*

■ Некалькі *Бел-Чырвона-Белых сьцягоў* былі ўзьнятыя ў навагоднюю ноч у сталічным мікрараёне Паўднёвы Захад. „Гэта былі першыя ў трэцім тысячагоддзі нацыянальныя сьцягі, узьнятыя над Беларусьсю,” — сказаў адзін з удзельнікаў акцыі.

## *СТУДЗЕНЬ-ЛЮТЫ (2001год)*

■ Дамоўленасьць аб выпрацоўцы адзінага сцэнара правядзеньня прэзыдэнцкіх выбараў дасягнута падчас сустрэчы лідэраў палітычных партыяў, сярод якіх і АГП. На сустрэчы абмяркоўваліся таксама кандыдатуры адзінага кандыдата ад дэмсілаў. Дык вось старшыня АГП А. Лябедзька заявіў, што „у гэтым пляне за тры гадзіны зроблена больш, чым за тры папярэднія месяцы”. Якія тэмпы, якая тытанічная напружанасьць калектыўнай палітычнай думкі! Праўда ані тры гадзіны, ані шэраг месяцаў не далі покуль імя жаданага „адзінага і непаўторнага” дэмкандыдата. А ўсім так цікава...

■ У чарзе на паляпшэньне жыльлёвых умоваў стаіць **580 тысячаў** беларускіх семьяў (!). Аднак многім зь іх прыдзецца чакаць яшчэ многія гады. Калі летась на бюджэтныя сродкі было пабудавана 1,2 мільёны квадратных мэтраў жыльля, то ў 2001 г. плянуецца толькі 700 тысячаў. Другое паведамленьне: паводле дадзеных камітэту па санацыі і банкруцтве, крызісны фінансавы стан маюць **58%** дзяржаўных прадпрыемстваў. Каля 800 суб’ектаў гаспадараньня неплацёжаздольныя, 300 – стратныя, 60 знаходзяцца пад пагрозай банкруцтва. У якой іншай краіне гэткія паведамленьні кваліфікаваліся б як прыкметы нацыянальнай катастрофы і банкруцтва пануючага рэжыму, але цяпер на Беларусі іншыя крытэрыі.

■ У сусьветнага пралетарыяту зьявіўся новы абаронца, хаця яго мы ведаем дастаткова даўно, яшчэ з часоў, калі панаваў ленінскі лёзунг „Прафсаюзы – школа камунізму”, а ўсіх нас не пытаючыся заявы аўтаматычна запісвалі ў гэтую школу. Цяпер сп. Уладзімер Ганчарык, старшыня ФПБ (што да апошняга часу называлася ў народзе дзяржаўнымі прафсаюзамі), які зьбіраецца балатавацца ў прэзыдэнты, запрапанаваў новыя дэвізы барацьбы за пралетарскае шчасьце. Дэвізы прагучалі 14 лютага на сумнавядомай плошчы Бангалёр (яна ж „сабачнік”), куды Ганчарык абяцаў папярэдне прывесьці да 100 тысячаў працоўных. Прыйшло каля 3 тысячаў, у асноўным зь ліку

прафсаюзнай эліты і начальства ў дарагіх шапках. Так, гэта той самы Ганчарык і той самы ФПБ, якія нядаўна заключылі дамову з расейскімі прафсаюзамі аб стварэньні новай прафсаюзнай арганізацыі ў рамках саюзу Беларусі і РФ. І яны таксама будуць нас аб’ядноўваць.

■ Ваўкавыская вертыкаль спарадзіла пастанову, якою патрабуе ад падначаленых абмежаваць кантакты з апазыцыяй. У вертыкальнай грамаце адзначаецца: „... лічым неабходным адміністрацыям навучальных установаў праводзіць працу па недапушчэньні ставарэньня філіяў апазыцыйных партыяў і гарамадзкіх арганізацыяў, народных унівэрсітэтаў”. Ёсьць у дакуманце і заклік паведамляць пра ўсе выпадкі „правядзеньня акцыяў і пранікненьня ў маладзёвы асяродак” аддзелу грамадзка-палітычнай інфармацыі райвыканкаму. Ну а той, зразумела, паведаміць, куды трэба.

***Валеры БУЙВАЛ***
***Прэс-сакратар Кансэрватыўна-Хрысьціянскай Партыі — БНФ***



*Беларуская дэманстрацыя ў Нью-Ёрку. 2001 год.*

# STATEMENT ON THE AGGRESSION OF THE IMPERIALIST CIRCLES OF RUSSIA

*On the 21 February 2001* the Russian State Duma has ratified the agreement on the introduction of the Russian ruble into Belarus concluded by Lukashenka and Putin in November 2000. The Russian mafia is in hurry to seize the Belarusan property and doesn’t wait for the ratification of this anti-constitutional act by the Lukashenka’s „chamber”. These actions of the Russian president Putin and the Russian State Duma represent ***the act of the outer aggression.***

The activity of the Belarusan politicians and the regime’s bodies can be qualified otherwise.

Lukashenka, signing this agreement, has violated the articles 136, 8 and 1 of the Constitution of the Republic of Belarus. There are these articles:

**art. 136: „The National Bank… has the exclusive right to emit the money.”**

**art. 8, indention 3: „It is not allowed to conclude the international agreements in contradiction to the Constitution”.**

**art. 1, indention 3: „Republic of Belarus defends its independence and territorial integrity, constitutional regime, guarantees the legal system and justice”.**

According to the concluded agreement the National Bank of Belarus lose the right of emission and the Belarusan State lose its main instrument of the sovereignty and national security – its proper currency. Lukashenka has violated consciously the Belarusan Constitution. According to the Criminal Codex of Belarus (part 13, chapter 32, art. 356) this violation is qualified as the state treason.

„Article 356. State treason

1. … to help to the foreign state in its hostile activity against the Republic of Belarus, to commit the criminal acts against the state according to the tasks of the bodies or representatives of the foreign state done intentionally by the citizen of Belarus **causing**

**the damage to the security of Belarus, its sovereignty, territorial inviolability, national security and defense (state treason),—**

is punished by the imprisonment from 7 till 15 years.

The MPs of the illegal „chamber” are ready to participate in this criminal act. They would vote this anti-constitutional agreement on the session in spring this year. It will be impossible to use any „constitutional act” as cover of this criminal act (Malafeyev, Masherava etc. hope to do this). The mentioned articles of the Constitution could be changed only on the referendum (even according to the redaction of the Constitution made in 1996, art. 140).

The criminal act commited by Lukashenka and his regime will cause the big losses and destruction. In the last seven years the regime conserved the Soviet economical methods, suppressed the initiative of Belarusan people, the Belarusan business, stopped the reforms. Now when the Russian agents have occupied the key positions in the state structures and economy, they carry out the occupation policy in accordance with the interests of the Russian imperialist circles. They are helping to the Russian oligarchs and mafia structures to seize the best Belarusan plants and the Belarusan property. Russia is planning to finish the occupation of Belarus using the economical aggression (introducing the Russian ruble).

We draw attention of the Belarusan citizens to the illegal and criminal acts of Lukashenka and his pro-Moscow regime. Lukashenka is in power illegally since 20 July 1999. The Russian agents have seized the key positions in the executive structures of power and economy and are destroying the Belarusan state, seizing the Belarusan property, assimilating the Belarusan people and forcing the Belarusans to leave the native country.

We declare that the deal about the formation of the so-called united state and its realization by Russia represent the act of aggression against Belarus. This is the act of state treason commited by Lukashenka and his regime.

We appeal to the citizens of Belarus to unite in front of danger of the Russian aggression.

We appeal to the Belarusans who work or serve on all the positions to base their activity only on the Constitution and laws. Decrees, disposals, orders and other illegal acts have not to be respected if they are contradicting to the Constitution and laws.

***Adopted by the Soim of the Conservative Christian Party – BPF***
*10.03.2001*

*(Пераклад зь беларускай мовы В.Буйвала)*

Беларускія Ведамасьці
Беларускае выданьне
У супрацоўніцтве зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам ў Амэрыцы
**Рэдакцыя: Зянон Пазьняк, Галіна Палачаніна**
**Адрас рэдакцыі: 02-017 Warszawa, Al. Jerozolimskie 125/127**
**тэл./факс: (+48 22) 628 76 73**